

**Як пажылыя валанцёры дапамагаюць старым**

СТАР. 13



**Што адбываецца ў беларускім кіно?**

СТАР. 15



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр ШАМКО, міністр спорту і турызму:**

***«Алімпійскі 2014-ы быў няпростым, ён быў адзначаны мноствам падзей. Усяго, па звестках на пачатак снежня мінулага года, беларускія атлеты заваявалі 558 медалёў на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах і Кубках свету і Еўропы. У іх ліку 158 залатых, 175 сярэбраных і 225 бронзавых. Зарэгістраваны 61 спартыўны рэкорд Беларусі. Аўтарамі найвышэйшых нацыянальных дасягненняў сталі 48 атлетаў. Найбольшая колькасць рэкордаў (16) устаноўлена ў плаванні 13 спартсменамі. У стральбе з лука абноўлена 10 рэкордных вынікаў 8 майстрамі гэтага віду, у кулявой стральбе — 9 і г.д. Лічбы, якія ўнушаюць пэўны аптымізм, але я не стаў бы перабольшваць іх значэнне. Яны — не самамэта, хоць і адлюстроўваюць ступень гатоўнасці атлетаў. Цяпер нашы намаганні накіраваны на належную падрыхтоўку да летняй Алімпіяды-2016 у Рыа-дэ-Жанейра».***

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СТУДЗЕНЯ 2015 г. СУБОТА № 1 (27859) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# МІРУ Ў ДУШЫ, МІРУ Ў СЕМ'ЯХ, МІРУ Ў КРАІНЕ!

## НАВАГОДНІ ЗВАРОТ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Дарагія суайчыннікі!

Чалавечае жыццё нярэдка параўноўваюць з дарогай. І гэта дарога з асаблівымі правіламі. Па ёй можна прайсці толькі адзін раз, і нельга павярнуць назад.

Старажытныя мудрацы вучылі: цаніце кожнае светлае імгненне жыцця, кожную радасць. Не дазваляйце дробным непрыемнасцям і засмучэнням захапіць вас. Не растрачвайце сябе на зайздрасць, крыўды і зласлоўе. Толькі тады вы пачняце жыць сапраўдным жыццём і знойдзеце непадробнае шчасце.

Мы часам, наракаючы на хуткацечныя цяжкасці, не заўважаем самага важнага, не цэнім тыя дары, якія падносіць нам жыццё.

Сапраўдныя каштоўнасці іншы раз не прыкметныя ў звычайнай мітусні. І часта людзі пачынаюць разумець іх значэнне толькі тады, калі страчваюць іх незваротна.

Галоўная каштоўнасць, за якую мы павінны дзякаваць лёсу, — гэта мір. Мір у нашых сем'ях, у нашай краіне, у адносінах паміж людзьмі.

Адыходзячы год раптоўна і трагічна даказаў нам сапраўдную каштоўнасць міру. Ён паказаў усім нам — любыя жыццёвыя праблемы адыходзяць на задні план, пачынаюць здавацца дробнымі і неістотнымі тады, калі рвуцца снарады, свішчуць кулі і ліецца кроў.

Няма ў чалавека нічога даражэйшага за жыццё. І няма права больш важнага, чым права на жыццё.

Нам трэба разумець і памятаць, на чым грунтуецца сапраўдны мір. І што з'яўляецца галоўнай пагрозай для яго.



Фота БЕЛТА.

Аснова сапраўднага міру — гэта дабрыня, цярпімасць і згода паміж людзьмі. Гэта гатоўнасць даравацьчужыя памылкі, гэта здольнасць у нечым паступацца сваімі інтарэсамі.

Мы на свае вочы пераканаліся, да чаго вядуць унутраны разлад, нянавісць і нецярпімасць. Ад яркіх і рэзкіх лозунгаў, якія сеюць варожасць, адзін крок да расколу грамадства. Ад расколу грамадства адзін крок да ўсеагульнай нянавісці. А ад яе адзін крок да вайны. І калі людзі забываюць пра каштоўнасць міру і згоды, то ўсе гэтыя тры крокі яны робяць у адно імгненне.

Сем дзесяцігоддзяў таму мы заплацілі за мір мільёнамі чалавечых жыццяў. Беларусы добра ведаюць цану міру і па сённяшні дзень захоўваюць асаблівае беражлівае стаўленне да яго.

Упэўнены, кожны з нас хоча найхутчэйшага аднаўлення міру на зямлі нашых братоў. Гэта шчырае, душэўнае пачуццё нашага народа. Мы, беларусы, зычым міру ўсім нашым сябрам і суседзям. Мы робім і будзем рабіць усё, што ад нас залежыць, каб зберагчы яго і абараніць.

Мір — гэта аснова жыцця і росквіту. І таму ў надыходзячым 2015 годзе перш за ўсё я зычу ўсім нам міру — міру ў душы, міру ў сем'ях, міру ў краіне!

Дарагія сябры!

Адыходзячы год падарыў нам нямала прычын для радасці.

Нас стала больш амаль на 7 тысяч чалавек. Дзяржава прыняла разгорнутую праграму па падтрымцы сем'яў з двaімі, траімі і больш дзецьмі. Гэта наш свядомы курс, які мы прадоўжым і ў далейшым.

Гэты год увойдзе ў нашу гісторыю як час памяці і патрыятызму. Усенароднае святкаванне 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў зноў нагадала нам: не бывае будучыні без мінулага, без сувязі пакаленняў. Наш агульны святы абавязак — клопат аб ветэранах, аб усіх старых, выхаванне на іх прыкладзе сваіх дзяцей і ўнукаў.

Адыходзячы год мы нездарма назвалі Годам гасціннасці.

Рэспубліка Беларусь расчыніла дзверы для ўсіх краін у час чэмпіянату свету па хакеі. Дзясяткі тысяч гасцей з самых розных куткоў планеты адкрылі для сябе Беларусь і беларусаў — утульную, прыгожую, дагледжаную краіну, у якой жыве спагадлівы, ветлівы і добры народ. Упэўнены, што кожны з нашых гасцей павёз з сабой часцінку радасці і цеплыні, падоранай яму беларускай зямлёй.

Усіх нас парадавалі спартсмены на зімняй Алімпіядзе. Уся краіна як адзін чалавек перажывала за нашых алімпійцаў — і яны не падвялі нас!

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***



Фота БЕЛТА.

Указ № 649 ад 30 снежня 2014 г.

## Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2014 года

**Разглядзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры і савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, узгодненыя з кіраўніцтвам Беларускай праваслаўнай царквы, пастанаўляю:**

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і мастацка-маральных традыцый, ідэй чалавекалюбства, дабрачыннасці і міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2014 года:

***аўтарскаму калектыву ў складзе протаіерэя Карасцялёва Ігара Еўдакімавіча, настаяцеля рэлігійнай абшчыны «Прыход храма іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» у г. Мінску Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, і Краўцовай Марыны Віктараўны, дацэнта кафедры асноў спецыяльнай педагогікі і псіхалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»,*** — за стварэнне вучэбна-вытворчых майстэрань рэлігійнай суполкі «Прыход храма іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» у г. Мінску Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы;

***калектыву дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь»*** — за ўвасабленне нацыянальна-гістарычнай тэматыкі ў спектаклях тэатра і пастаноўку балета «Вітаўт»;

***калектыву дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы»*** — за вялікі ўклад у развіццё дзяржаўнай сістэмы сацыяльнай абароны, сцвярджэнне ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці ў грамадстве;

***калектыву ўстановы адукацыі «Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня»*** — за значныя дасягненні ў развіцці здольнасцяў таленавітых і адораных дзяцей і падлеткаў, выхаванне будучых грамадскіх лідараў;

***Цэнтральнаму камітэту грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»*** — за значны ўклад у грамадзянскае выхаванне і фарміраванне патрыятычнай самасвядомасці моладзі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2014 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэміі, атрыманых у адпаведнасці з гэтым Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Указ № 650 ад 30 снежня 2014 г.

## Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года

**Разглядзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры і савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, пастанаўляю:**

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага і выяўленчага мастацтва, кінавідэамастацтва, музейнай справы, народнай мастацкай творчасці, архітэктуры, выхаванне творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года:

***ансамблю песні і танца «Медуніца» ўстановы культуры «Магілёўская абласная філармонія»*** — за значны ўклад у захаванне і развіццё традыцыйнай беларускай музычнай культуры, актыўную канцэртную дзейнасць;

***аўтарскаму калектыву закрытага акцыянернага таварыства «Сталічнае тэлебачанне» ў складзе Адашкіна Аляксея Васільевіча, дырэктара дырэкцыі спецыяльных праектаў, і Макей Вольгі Сяргееўны, карэспандэнта спецыяльнай службы карэспандэнтаў дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання,*** — за стварэнне цыкла дакументальных фільмаў «Шай-бу! Shai-BY!..»;

***аўтарскаму калектыву ў складзе Боганевай Алены Міхайлаўны, супрацоўніка дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Варфаламеевай Тамары Барысаўны, старшага навуковага супрацоўніка гэтай навуковай установы, і Козенкі Мікалая Аляксеевіча, педагога дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі «Ветразь» Кастрычніцкага раёна г. Мінска,*** — за стварэнне фундаментальнага навуковага 6-томнага выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў»;

***аўтарскаму калектыву ў складзе Дамнянковай Людмілы Уладзіміраўны, дацэнта кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Лабковіча Пятра Віктаравіча, дырэктара творча-эксперыментальнага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «ГУДАРТ», і Лазукі Барыса Андрэевіча, загадчыка аддзела старажытнабеларускай культуры дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,*** — за вялікую навуковую і творчую працу па адраджэнні традыцый нацыянальнай культуры і асабісты ўклад у стварэнне экспазіцыі музея гісторыі слуцкіх паясоў на базе рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы» ў г.Слуцку Мінскай вобласці;

***калектыву дзяржаўнай установы «Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»*** — за вялікі ўклад у захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і стварэнне новай экспазіцыі ў Паўднёва-ўсходняй казарме Цытадэлі Брэсцкай крэпасці «Музей вайны — тэрыторыя міру»;

***калектыву дзяржаўнай установы культуры «Творчыя майстэрні «Цэнтр сучасных мастацтваў»*** — за вялікі ўклад у прапаганду сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі і арганізацыю значных выставачных праектаў;

***калектыву Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці*** — за значныя дасягненні ў справе адраджэння і развіцця народных рамёстваў, захаванне і папулярызацыю традыцыйных тэхналогій вытворчасці неглюбскіх ручнікоў;

***Багласаву Сяргею Георгіевічу, члену грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз архітэктараў», галоўнаму спецыялісту камунальнага будаўніча-эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінская спадчына»,*** — за значны асабісты ўклад у рэстаўрацыю і аднаўленне гісторыка-культурнага комплексу плошчы Свабоды з прылеглай забудовай у г.Мінску;

***Бандарэнку Сяргею Афанасьевічу, мастаку-скульптару, члену грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз мастакоў»,*** — за вялікі ўклад у развіццё беларускага выяўленчага мастацтва і стварэнне высокамастацкіх твораў манументальнай і станковай скульптуры;

***Ганчаруку Уладзіміру Іванавічу, прафесару кафедры малюнка ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»,*** — за вялікі асабісты ўклад у развіццё выяўленчага мастацтва Беларусі і выхаванне таленавітай моладзі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з гэтым Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# МІРУ Ў ДУШЫ, МІРУ Ў СЕМ'ЯХ, МІРУ Ў КРАІНЕ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарагія сябры!

Праз некалькі імгненняў настане 2015-ы год. Год Вялікай Перамогі і Год моладзі, у якім сімвалічна перасякаюцца наша мінулае і наша будучыня. Год, калі нам з вамі трэба будзе рабіць выбар і вызначаць: як будзем жыць далей, на што спадзявацца, да чаго імкнуцца.

Напэўна, у кожнага народа ёсць той запаветны вобраз, з якім у яго звязана родная зямля.

Для мяне гэта невялікі, але моцны, цёплы і ўтульны дом, дзе ў пашане жывуць старыя, працуюць гаспадары, сталее моладзь і падрастаюць шчаслівыя дзеці.

Беларусь — наш агульны дом, які толькі мы самі можам напоўніць дастаткам і шчасцем.

У гэтыя хвалюючыя хвіліны мне хочацца, каб усе беларусы ўсвядомілі, як мы, па сутнасці, цесна звязаны адзін з адным на гэтым невялікім, падораным нам Богам кавалку Зямлі.

У навагоднюю ноч я хачу павіншаваць нашых бацькоў і ўсіх ветэранаў, падзякаваць ім за ўсё, што яны зрабілі для краіны.

Нашых цудоўных жанчын, якія, пароўну падзяляючы з мужчынамі цяжар турбот і клопатаў, застаюцца пяшчотнымі і прыгожымі.

Нашых дзяцей, якія так шчыра вераць нам; дзяцей, якіх мы абавязкова павінны вывесці на правільную дарогу жыцця.

І ўсіх нас, хто сваімі ўмелымі рукамі і майстэрствам, талентам і сілай навуковага азарэння, стойкасцю і мужнасцю ўносіць уклад ва ўмацаванне і росквіт Беларусі.

Навагодняя ноч — гэта час, калі мы па-асабліваму ўсведамляем, якія мы блізкія, як патрэбны адно аднаму і не можам жыць без любові і падтрымкі родных людзей.

Дык давайце падзякуем адно аднаму за дапамогу, клопат і ўвагу.

Няхай у кожнай сям'і будзе трохі радасці і цяпла. Няхай будзе шмат гэтай радасці і цяпла!

Няхай на нашай зямлі заўсёды пануюць згода, дастатак і мір.

Шчасця вам і здароўя, дарагія землякі.

**З Новым годам, Беларусь!**

■ Імгненні свята

## З ВІЦЕБСКІМ КАЛАРЫТАМ

**У Віцебску навагоднія мерапрыемствы традыцыйна разнастайныя, ёсць сярод іх і ўнікальныя.**

Напрыклад, яшчэ напрыканцы мінулага года ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова адбылася ўнікальная «Партызанская ёлка». Дырэкцыя музея прапанавала гараджанам і гасцям Віцебска перанесціся ў часе. Тут можна было ўбачыць на свае вочы, як падчас Вялікай Айчыннай партызаны ды і немцы святкавалі Новы год. Пастараліся члены ваенна-гістарычнай рэканструкцыі, якія прадэманстравалі фрагменты часоў вайны. Таксама былі прэзентаваны выставы «Навагодняя ёлка — мінулае, сучаснасць, будучыня» і прысвечаная Першай сусветнай вайне...

Адсвяткаваць Каляды, як гэта рабілася ў дарэвалюцыйны час, можна ў сядзібе-музеі І. Рэпіна, якая знаходзіцца кіламетрах у 20 ад Віцебска. Мерапрыемства праходзіць штодня, уключаючы 7 студзеня.

У абласным цэнтры, на беразе Заходняй Дзвіны, у святочныя дні забаўляе дзятву і дарослых віцебскі «сабрат» Дзеда Мароза — Мароз Марозавіч. Яго сядзіба працуе на тэрыторыі культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кольца Віцебска «Дзвіна».

У Беларускім тэатры «Лялька» ў гэтыя дні — самы напружаны час. Штодня лялечнікі даюць ажно па два спектаклі. «Дзед Мароз і шкодны заяц» з ёлачнай праграмай «Калядная гісторыя».

Па добрай традыцыі ў Віцебскай праваслаўнай семінарыі адбудзецца свята духоўнай музыкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Радасць на Каляды

**Шмат карысных рэчаў сабралі валанцёры падчас дабрачыннай акцыі «Дары радасць на Каляды», арганізаванай сумеснымі намаганнямі бабруйскіх Свята-Іверскага і Свята-Ільінскага храмаў.**



У спіс прадметаў першай неабходнасці для шэрагу дзіцячых сацыяльных устаноў Бабруйска і раёна трапілі памперсы, сродак асабістай гігіены, канцтавары, дзіцячае харчаванне.

— Было раздадзена больш за 5 тысяч лістовак з запрашэннем падтрымаць добрую справу, і шмат хто адгукнуўся, — паведаміў **дырэктар нядзельнай школы Свята-Іверскага храма Павел ЛУКІН.** — Кранула, што ахвяравала шмат моладзі, людзей не самых забяспечаных. Дзякуй усім за шчырае сэрца.

Падарункі, якіх, па словах арганізатараў, атрымалася «вялікая гара», засталося размеркаваць па ўстановах. Дапамога паступіць у дзіцячы сад №9, дзе выхоўваюцца дзеці з цяжкімі парушэннямі маўлення, дзіцячы дом для дзяцей-інвалідаў, Бабруйскі дом дзіцяці, сацыяльныя прытулкі, шматдзетныя сем'і. Плануецца, што гэта адбудзецца на працягу калядных свят і будзе суправаджацца цікавай канцэртнай праграмай, якую падрыхтавалі выхаванцы нядзельных школ названых храмаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## СЯМ'Я ДЛЯ 36 ДЗЯЦЕЙ

**Менавіта столькі выхаванцаў прайшло праз дзіцячы дом сямейнага тыпу Сяргея і Маргарыты Кундзікавых з Клічава. І з іх толькі чацвёра дзяцей — родныя.**

Сёння ў вялікай сям'і жывуць 15 дзяўчатак і хлопчыкаў. У апошні дзень мінулага года яны разам з прыёмнымі бацькамі атрымалі запрашэнне ў госці ад сваіх пастаянных шэфаў з МНС. У Магілёве ім паказалі музей пажарнай службы і запрасілі ў спецыялізаваны рэстаран «101». Каля навагодняй ёлкі іх чакала сустрэча з казачнымі героямі і забаўляльная праграма з конкурсамі, гульнямі і віктарынамі. Начальнік абласнога ўпраўлення МНС Андрэй Пражогін павіншаваў дзятву са святам і перадаў ім салодкія падарункі.

Дарэчы, дзякуючы ратавальнікам на працягу некалькіх гадоў у выхаванцаў Кундзікавых з'явіліся камп'ютар, розная лічбавая тэхніка, мэбля для дзіцячых пакояў, спартыўны інвентар. А каб у доме заўсёды было цёпла і ўтульна, шэфы ўсталявалі тут газавы кацёл і ўзялі на сябе абавязкі па нарыхтоўцы дроў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## НОВЫ ГОД — У НОВЫХ КВАТЭРАХ...

**сустрэлі ў Віцебску больш за дзве тысячы сем'яў, паведаміў Віктар НІКАЛАЙКІН, старшыня Віцебскага гарвыканкама.**

Таксама летась створана звыш 3 тысяч новых працоўных месцаў. Былі здадзены пад ключ многія аб'екты грамадскага і сацыяльнага прызначэння.

— Пасля рэканструкцыі і будаўніцтва адкрылася больш за 100 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Сярод іх — гандлёва-забаўляльны цэнтр «Мега» і першы ў горадзе рэстаран «Макдональдс». У 2014 годзе былі ўведзены ў эксплуатацыю тэрапеўтычны корпус гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, падземны пешаходны пераход пад вуліцай Леніна, першы надземны пераход у мікраёне «Білева», яслі-сад у мікраёне «Медцэнтр», — удакладніў мэр горада.

Сёлета, падкрэсліў Віктар Нікалайкін, асаблівая ўвага будзе надавацца клопату пра ветэранаў, забеспячэнню фізічнага і маральнага здароўя падрастаючага пакалення.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» глыбока смуткуе з прычыны смерці былой супрацоўніцы газеты «Звязда» ПІЛЕВІЧ Люцыі Станіславаўны і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыцы.**

■ На канікулах

# СВЯТКУЙ, ЯК КНЯЗЬ

**Правесці калядны адпачынак цяпер можна ў стылі XIX стагоддзя. Такую магчымасць сваім наведнікам дае з 2 па 8 студзеня Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж».**

У гэтыя дні на тэрыторыі замка можна будзе акунуцца ў атмасферу больш як стагадовай даўніны, калі рэзідэнцыяй валодаў князь Антоній Вільгельм Радзівіл. Аматараў гісторыі будзе чакаць адпаведная музыка, тэатральныя пастаноўкі і іншыя забаўляльныя мерапрыемствы. Балетмайстар тэатральнай школы Францішкі Уршулі Радзівіл будзе праводзіць для дзяцей майстар-класы па старадаўніх танцах. У палацавым ансамблі можна будзе прасачыць гісторыю аднаўлення рэзідэнцыі ў канцы XIX стагоддзя.

Уваход у ратушу для школьнікаў і студэнтаў каштуе 15 000 рублёў, для дарослых — 30 000. Трапіць у палацавы ансамбль школьнікам і студэнтам можна за 50 000, дарослым — за 100 000 рублёў. Да 11 студзеня комплекс працуе без выхадных.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■

■ Цуды здараюцца

# А пад ёлкай... двойня!

**Напэўна, найлепшы падарунак сваім родным і блізкім на гэты Новы год зрабіла Аксана Канстанцінава. 1 студзеня ў 0:01 у Гродзенскім абласным клінічным перынітальным цэнтры яна нарадзіла двойню: хлопчыка і дзяўчынку! Гэта першыя і доўгачаканыя дзеці ў сям'і Канстанцінавых, шчаслівыя бацькі ўжо выбралі для іх імёны: дзяўчынку назавуць Маргарытай, а хлопчыка, хутчэй за ўсё, Ягорам.**

Акрамя Аксаны, у навагоднюю ноч у згаданым цэнтры падарылі жыццё сваім дзецям яшчэ 9 парадзіх. Маладых мам у першы дзень 2015 года наведалі з віншаваннямі і падарункамі прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі і дэпутаты. Дарэчы, традыцыя штогадовага віншавання першых новых гродзенцаў тут існуе ўжо каля 10 гадоў.

Усяго за першыя 12 гадзін 2015 года ў Гродзенскай вобласці нарадзілася 13 дзетак. У 2014 годзе ў абласным перынітальным цэнтры было прынята 4 106 родаў, гэта на 63 больш, чым у 2013-м.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■

■ Надвор'е

# ХУТКА ПРЫМАРОЗІЦЬ

**Цяперашняя адліга ў пачатку наступнага тыдня зноў зменіцца замаразкамі. Пра гэта паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Святлана РЫБАКОВА.**



Ужо сёння ў краіне ўсталюецца сырое, ветранае і адліжнае надвор'е з ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу на большай частцы тэрыторыі краіны. Тэмпература паветра будзе вагацца ад -3 да +3 градусаў. У некаторых раёнах чакаецца моцны парывісты вецер. На дарогах з'явіцца галалёдзіца. Заўтра чакаецца паніжэнне сярэдняй тэмпературы па краіне, на працягу сутак яна будзе вагацца ад -4 да +2 градусаў з ападкамі ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Захаваюцца ветранае надвор'е і галалёдзіца.

У пачатку наступнага тыдня тэмпература паветра будзе паніжацца — да -6 градусаў у панядзелак.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■

■ Будзьце ў курсе!

# АБВЯСЦІЦЕ ЎВЕСЬ СПІС, КАЛІ ЛАСКА...

**2015-ы сустракае нас новым памерам падаходнага падатку, уступленнем у сілу сямейнага капіталу, падняццем мінімальнага стажу да 15 гадоў, а таксама наркалагічнай дапамогай на даму. Якія яшчэ новаўвядзенні з'явіліся з надыходам 2015 года?**



## САЮЗ

Запрацаваў Еўразійскі эканамічны саюз. Беларусь — першая краіна, якая старшынствуе ў гэтым інтэграцыйным аб'яднанні. У склад саюза ўваходзяць Расія, Казахстан, Беларусь і Арменія, а неўзабаве з'явіцца яшчэ адзін удзельнік — Кыргызстан.

## ПАДАТКІ І АКЦЫЗЫ

Стаўкі зямельнага, экалагічнага падатку на здабычу прыродных рэсурсаў, адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў індэксуюцца ў 2015 годзе на 13,8%. Прадугледжваецца і павышэнне ставак акцызаў. Напрыклад, на тытунёвыя вырабы акцызы павысяцца на 15-30%, на моцны алкаголь — на 6%. Акцызы на піва і аўтамабільнае паліва захаваюцца на ўзроўні 2014 года. Акрамя таго, змены прадугледжваюць павышэнне падаходнага падатку з 12% да 13%. Сродкі ад яго павышэння пойдуць на падтрымку сем'яў з дзецьмі.

## КАМУНАЛКА

Па-новаму будзем разлічвацца за электраэнергію. Аднастаўачны тарыф за 1 кВт·г у жылых дамах (кватэрах) з электрычнымі плітамі складае 801 рубель. Дыферэнцаваны тарыф па часавых перыядах вызначаны ў памеры 560 рублёў для мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00) і 1602 рублі для максімальных (з 17.00 да 22.00). Што тычыцца кошту цеплавой энергіі, то тыя, хто карыстаецца прыборамі індывідуальнага ўліку расходу газу, за кубічны метр блакітнага паліва будуць плаціць крыху больш за дзве з паловай тысячы, за тую ж колькасць звадкаванага газу — 32,6 тысячы. Для жыльцоў, у якіх прыбораў няма, прадугледжаны іншыя нормы.

## ДЫСЦЫПЛІНА

Уступае ў сілу Дэкрэт №5, які ўзмацняе патрабаванні да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый. Дакумент накіраваны на выкараненне безгаспадарчасці, умацаванне вытворча-тэхналагічнай, працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны, а таксама спыненне фактаў працаўладкавання нядобрасумленных кіраўнікоў на новую кіруючую пасаду.

## ДАЧНІКІ

Указам №387 ад 4 жніўня 2014 года з 2015-га ўводзіцца забарона на здзяйсненне здзелак з зямельнымі ўчасткамі, выдзеленымі ў прыгараднай зоне Мінска і абласных цэнтраў для вядзення калектыўнага садоўніцтва, і з размешчанымі на іх аб'ектамі нерухомасці да заканчэння пяці гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ўзнікнення правоў на такія зямельныя ўчасткі. Уводзіцца таксама забарона на стварэнне ў прыгараднай зоне Мінска новых садоўніцкіх таварыстваў, дачных кааператываў. Акрамя таго, свабодныя зямельныя ўчасткі ў садоўніцкіх таварыствах у прыгараднай зоне Мінска будуць прадастаўляцца выключна па выніках аўкцыёнаў.

## 50 РУБЛЁЎ

З 1 студзеня 2015-га спыняецца выпуск у абарачэнне банкнот Нацыянальнага банка Беларусі наміналам 50 рублёў узору 2000 года, а таксама банкнот гэтага наміналу мадыфікацыі 2010 года. Да 1 ліпеня 2015 года банкноты падлягаюць прыёму пры ўсіх відах плацяжоў усімі суб'ектамі гаспадарання, у тым ліку і банкамі краіны. Абмяняць банкноты наміналам можна будзе без абмежаванняў і без спагнання камісійнага ўзнагароджання ў любой суме, кратнай 100 рублям. З 1 ліпеня па 31 снежня 2015-га ўключна гэта можна будзе зрабіць у Нацыянальным банку і банках краіны. А з 1 студзеня па 31 чэрвеня 2016-га ўключна — толькі ў Нацбанку. З 1 ліпеня 2016 года банкноты наміналам 50 рублёў будуць выключаны з абарачэння і лічыцца несапраўднымі.

## ПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ

Сем'і, дзе цягам пяці гадоў з'явіцца трэцяе і наступнае дзіця, атрымаюць сямейны капітал. Такой формай дапамогі можна скарыстацца толькі адзін раз і накіраваць грошы на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, медыцынскіх ці сацыяльных паслуг. Сума — 10 тысяч долараў плюс працэнты, якія набягуць за 18 гадоў. Матэрыяльна падтрымаюць і тыя сем'і, што выхоўваюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў. Яны будуць атрымліваць штомесячную дапамогу, памер якой складае палову бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

## ПЕНСІІ

Мінімальны працоўны стаж з выплатай страхавых узносаў у Фонд сацабароны, неабходны для атрымання пенсіі па ўзросце і за выслугу гадоў, павялічыцца з 10 да 15 гадоў. На пяць гадоў пазней будуць выплачвацца сацыяльныя пенсіі людзям, якія не маюць мінімальнага страхавога стажу і не атрымліваюць пенсій з іншых дзяржаў (мужчынам з 65-ці гадоў, жанчынам — з 60-ці). Змены не закрануць сацыяльна ўразлівыя катэгорыі грамадзян. Вырастуць пенсіі ў тых, хто мае доўгі працоўны стаж і невялікія заробкі. Для гэтага павялічыцца мінімальны кошт аднаго года стажу звыш 35 гадоў у мужчын і 30 гадоў у жанчын (ён будзе складаць амаль 40 тысяч рублёў). Каб павысіць пенсіі, гранічную велічыню сярэдняга заробку для выплаты абавязковых страхавых узносаў у бюджэт фонду зробяць пяціразовай.

## АДКАЗНАСЦЬ

Уступілі ў сілу дапаўненні і змяненні ў законе «Аб сродках масавай інфармацыі». Дзеянне яго цяпер распаўсюджваецца і на інтэрнэт-СМІ. Сеткавыя выданні будуць несці адказнасць за апублікаваную інфармацыю нароўні з афіцыйнымі. Калі ўладальнік інтэрнэт-рэсурсу атрымае два і болей пісьмовых папярэджанняў за год або на сайце будзе змешчана забароненая інфармацыя, доступ да СМІ могуць абмежаваць. Паменшаны таксама замежны ўплыў на беларускую медыяпрастору. Замежная доля ў статутным капітале ці акцыях СМІ не павінна перавышаць 20 працэнтаў. Новаўвядзеннем стане абавязковы агульнадаступны пакет тэлепраграм.

## НАРКОТЫКІ

Згодна з дэкрэтам № 6, становіцца больш жорсткай адказнасць за злачынствы ў сферы незаконнага абарачэння наркотыкаў. Максімальны тэрмін пазбаўлення волі для гандляроў псіхатропнымі сродкамі павялічваецца да 20 гадоў (калі чалавек памёр пасля ўжывання набытага дурману — да 25). З 16 да 14 гадоў зніжаецца ўзрост надыходу крымінальнай адказнасці за дзеянні, звязаныя са збытам наркотыкаў. Штраф за знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане наркатычнага ап'янення — 5-10 базавых велічынь.

## МІНІМАЛКА

Са студзеня мінімальная заработная плата складае 2 мільёны 100 тысяч рублёў. Гадзінны мінімальны заробак вызначаецца наймальнікам шляхам падзелу месячнага мінімальнага заробку на суадносіны разліковай нормы працоўнага часу каляндарнага года, вызначанай для адпаведных катэгорый работнікаў, і колькасці месяцаў. Нагадваем таксама, што базавая велічыня павялічылася да 180 тысяч рублёў.

## МОЛАДЗЬ

2015-ы абвешчаны Годам моладзі. План мерапрыемстваў, зацверджаны ўрадам, уключае больш за 70 пунктаў. Мерапрыемствы прысвечаны патрыятычнаму выхаванню моладзі, прапагандзе здаровага ладу жыцця, развіццю масавага спорту, фарміраванню культуры бяспечнай жыццядзейнасці, падтрымцы маладых людзей, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю. Частка мерапрыемстваў будзе таксама накіравана на падтрымку творчай актыўнасці, выяўленне таленавітай і адоранай моладзі.

## ДЫЗЕЛЬ

У Беларусі з 1 студзеня 2015 года на аўтазапраўках будзе прадавацца дызельнае паліва толькі экалагічнага класа К5. Плануецца, што кошт на паліва ДТ-К5 захаваецца на ўзроўні К4.

## «ХАТНІ» НАРКОЛАГ

Дзяржаўным установам аховы здароўя, у тым ліку наркалагічным дыспансерам, дазволена аказваць наркалагічную і таксікалагічную дапамогу ананімна на даму на платнай аснове пры захаванні ліцэнзійных патрабаванняў. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў №1241 ад 24 снежня 2014 года. Норма дасць магчымасць павысіць даступнасць падобнай дапамогі.

## МІКРАПАЗЫКА

Мікрафінансавыя арганізацыі пачынаюць працаваць паводле нормаў Указа № 325 «Аб прыцягненні і прадастаўленні пазык, дзейнасці мікрафінансавых арганізацый». Дакумент прадугледжвае ўдасканаленне парадку ажыццяўлення дзейнасці па рэгулярным прыцягненні і прадастаўленні пазык. З 1 студзеня 2015-га гэтую дзейнасць змогуць ажыццяўляць толькі мікрафінансавыя арганізацыі — ламбарды, спажывецкія кааператывы фінансавай узаемадапамогі, таварыствы ўзаемнага фінансавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, фонды. Мікрапазыкі для фізічных асоб на спажывецкія мэты змогуць даваць толькі ламбарды і выключна пад заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага або хатняга выкарыстання.

**Падрыхтавалі Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■





УНП 191228804

Ликвидатор ЧУП «Белавтоальфа»
**объявляет о проведении 03.02.15 г. в 11.00**
**по адресу: Минск, Хоружей, 31а- 313 торгов**
**по продаже следующего имущества ЧУП «Белавтоальфа»:**

**АВТОМОБИЛЬ (ГРУЗОВОЙ ТЯГАЧ)**
**MersedesАктрос 1846, 2000 г/в.**

Есть технические неисправности.

Начальная цена – 50 000 000 рублей без НДС. Шаг торгов – 5%.

*Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на расчетный счет 3012210766005 в ОАО «Альфа-Банк», МФО 153001270 (г. Брест, ул. Советская, 56); УНП 290959341.*

На усмотрение ликвидатора оплата покупателем предмета торгов производится на основании договора уступки права требования (перевода долга) в счет оплаты Продавцом расходов, связанных с ликвидацией. Имущество может быть продано единственному участнику торгов.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: **220002, Минск, а/я 33 в срок по 26.01.15 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в трехдневный срок с даты проведения торгов, а приобретенное имущество должно быть оплачено в течение трех дней с момента подписания договора.

**Справки по телефону 8 017 289-58-88.**

**Место нахождения имущества: г. Брест, ул. Коммерческая.**


■ Выйсце ёсць!

# ЗАБЯРЫ МЯНЕ ДАДОМУ...

## Чатыры гады сям'я з Гомельскага раёна вяртала права выхоўваць сваіх родных дзяцей

**Калі мы знаёміліся са Святланай Джумаевай, яна практычна адразу заявіла: «Я — запойная алкагалічка». І падзялілася сваёй гісторыяй, якая ўражвае шчырасцю эмоцый. Паспрабую максімальна іх захаваць. Менавіта таму далей яе расказ пра свой няпросты лёс — ад першай асобы.**

— Я круглая сірата. Калі выйшла замуж за Аляксея, мы жылі то ў адной бабулі, то ў другой. Мяне, як праз некаторы час высветлілася, не паставілі своечасова на ўлік, і таму доўгі час у нашай сям'і не было свайго жылля. І дзяцей, якія нарадзіліся, забралі таму, што былі праблемы з жыллём, і таксама таму, што мы з мужам выпівалі.

Калі прыходзіла да свайго нарколага, яна мне казала: са 100 чалавек толькі 3-4 прызнаюць, што яны алкаголікі. Менавіта такія сапраўды змогуць кінуць піць, бо разумеюць сваю праблему.

Я, калі пачынаю піць, на тыдзень-два ўвогуле выпадаю з жыцця. Было, што два гады не піла. Потым сарвалася. Шчыра скажу: я чатыры разы кадзіравалася, але не дапамагае гэта, калі сам не захочаш кінуць піць. Кадзіравалася, не піла, потым зрывалася, зноў кадзіравалася. Мне дрэнна было, я купіла сабе гарэлкі — і ўся кадзіроўка зноў прапала дарэмна.

Калі я п'ю — не магу сама спыніцца. Мне патрэбна, каб нехта стукнуў па стале, замкнуў мяне дома і пакінуў разважаць над жыццём. Вось так пасядзіш дзень-два — і спынаешся. За час, пакуль не п'еш, пра ўсё перадумаеш. Узгадваеш усіх, хто цябе любіць і ненавідзіць. Потым даходзіць: а навошта піць, калі можна інакш? Можна добра жыць, калі ў цябе нічога не баліць, няма даўгоў, няма праблем, дзеці прыйдуць і скажуць: «Добрай раніцы!» А калі ты напіўся — хто табе скажа такія словы? Ніхто. Нават муж. Ён цяпер не п'е таксама. Дарэчы, мы, калі выпівалі, пачыналі адразу сварыцца паміж сабой, і справа ледзь не даходзіла да разводу.

Калі жыллё прызналі непрыдатным для пражывання дзяцей, я не працавала. Малодшаму сыну тады было два гады. Да нас прыехалі і сказалі: ёсць дакумент, мы забіраем дзяцей ад вас. Тады я паабяцала, што абавязкова іх вярну.

Праз некаторы час я ўладкавалася працаваць на птушкафабрыку «Рассвет». Спачатку ў палявой брыгадзе працавала, а потым стала птушкагадоўцай.

> **Бачыла і шмат багатых жанчын, якія таксама, як і я, маюць залежнасць ад алкаголю. Яны прапівалі кватэры, машыны...**

Я часта тэлефанавала дзецям, якія ў той час жылі ў прыёмнай сям'і, мы пастаянна да іх прыязджалі. Кожны раз пыталіся: «Калі дадому паедзем?» І гэта прымушала думаць: сапраўды, стоп. Я не хачу, каб мае сыны жылі так, як жыла я: без бацькоў, нікому не патрэбная. Калі б не дзеці, магчыма, і далей мой лёс ішоў бы па нахільнай.

Мне старэйшы сын Коля тады сказаў: «Матуля, я буду вучыцца на адны «дзясяткі», я заўжды буду мыць посуд, ты толькі не пі і нас дадому забяры!» Вось тады я плакала, і муж мой таксама. Менавіта пасля гэтага прыйшла да намесніка дырэктара птушкафабрыкі Наталлі Кісялёвай спытацца — да каго звяртацца, што рабіць, каб дзяцей сваіх вярнуць. Калі б не Наталля Вадзімаўна, магчыма, мне б да гэтага часу іх не вярнулі. З кожным невялікім і вялікім пытаннем бегала да яе. У маім жыцці з'явіўся чалавек, да якога я магла прыйсці пагаварыць або проста паплакаць. Яна заўсёды казала: «Супакойся, абавязкова ўсё вырашым, што-небудзь прыдумаем». Так мы і дакументы на дзяцей падавалі: я ж не ведала, якія паперы патрэбны, з чаго пачынаць, куды да кого звярнуцца.

Вярталі права выхоўваць родных дзяцей амаль чатыры гады. У нас вылічвалі 70% ад заробку на аліменты. Заставалася толькі на праезд, ежу і рамонт у выдзеленым доме, дзе спачатку не было ні дзвярэй, ні падлогі — мы ўсё гэта рабілі самі на працягу года.

Мне старэйшы аднойчы патэлефанаваў і спытаў: «Мама, а ты мяне праўда забярэш ці толькі галаву мне дурыш?» Ён мне не верыў... Вядома, я растлумачыла, што мы іх забяром, але ж гэта не так хутка робіцца. Коля мне штодзень тэлефанаваў і кантраляваў: «А што вы сёння зрабілі ў кватэры?» Ён патрабаваў падрабязнай справаздачы, і мы яму ўсё расказвалі: што мэблю купілі ў іх пакой, якога колеру, куды паставілі... Яму было ўсё цікава. Маленькі Ваня таксама пытаў: «Мама, калі ты прыедзеш? Ты ж не забудзься, я вельмі люблю салодкае».

Калі рамантавалі жыллё, выклікалі спецыялістаў з сельсавета. Яны прыходзілі, глядзелі, што зроблена, ацэньвалі, што добра, што трэба палепшыць. Нарэшце камісія з райвыканкама склала акт, што ўсё ў доме здавальняюча. Наталля Кісялёва зноў прыязджала, глядзела, ці прыйшоў час падаваць дакументы на вяртанне дзяцей. Яна кудысьці тэлефанавала, пра ўсё дамаўлялася.

Мне далі вялізны спіс дакументаў. Мы сабралі 30 розных паперак, падалі заяву ў суд. Я вельмі баялася — мне здавалася, што могуць адмовіць ці дзеці адмовяцца ад мяне. Суд быў 6 кастрычніка, а 17-га мы забралі дзяцей дадому.

Калі мае хлопчыкі прыйшлі ў дом, пабачылі свой пакой, адразу ж падзялілі ложкі. Пытаюць: «Матуля, кажы, што мы павінны рабіць?». Старэйшы любіць гатаваць і нават дапамагае мне пячы кексы. Усе разам любім пазлы складаць. У мяне дзіця пайшло ў школу лепш за ўсіх апранутае. Сёння я магу купіць дзецям не толькі прысмакі, але і добрую цацку. Вось нядаўна набылі вялікую цацку-машыну, якая ім спадабалася. З прадуктамі ўвогуле ў нас няма праблем, бо на прадпрыемстве можна па льготнай цане набыць.

У мяне была магчымасць перайсці працаваць бліжэй да дома, але я не хачу на іншае прадпрыемства. Гэта мая афіцыйная першая работа, і я да яе прывыкла. Акрамя заробку, мяне тут падтрымлівае кіраўніцтва прадпрыемства. Я калісьці неафіцыйна працавала на аўтамыйцы, дык там не тое што да начальства, да калег нельга было падысці з нейкім пытаннем.

Калі лячылася, бачыла шмат розных людзей, сярод іх была жанчына, якая памерла ад цырозу печані. Яе старэйшага сына пасадзілі, малодшага забралі. Хаця быў перыяд, калі яна не піла ўвогуле — як лялька хадзіла. Бачыла і шмат багатых жанчын, якія таксама, як і я, маюць залежнасць ад алкаголю. Яны прапівалі кватэры, машыны...

Адначасова са мной у маёй аднакласніцы забралі дачку, аднагодку майго старэйшага сына. Між іншым, дзяўчынка дадому не хоча вяртацца. Яе дома не кармілі, маці ёй зусім не займалася. Калі чалавек хоча знайсці выйсце, ён яго знойдзе. Калі не, яму нічога не дапаможа. Такім і дзеці не патрэбны.

> **Я не хачу, каб мае сыны жылі так, як жыла я: без бацькоў, нікому не патрэбная. Калі б не дзеці, магчыма, і далей мой лёс ішоў бы па нахільнай.**

Некаторыя да гэтага часу не вераць, што я кінула піць. Многія здзіўляюцца, што мне дзяцей вярнулі. Кажуць — не верылі, што ты здольная спыніцца, задумацца і змяніць сваё жыццё. Я хачу сказаць усім, у каго забралі дзяцей за п'янства, — рабіце ўсё, каб забраць іх назад, яны так гэтага хочуць!

Як бы дзецям ні было добра ў прыёмных сем'ях ці дзіцячых дамах, куды б іх ні вазілі — у санаторыі, замежжа — і колькі б ні куплялі для іх дарагіх падарункаў — ніхто ім сапраўдную маці не заменіць. Няхай дома будзе ўсяго значна менш, але гэта іх дом. Дзеці гэта адчуваюць. Мой сын неяк сказаў: «Я не магу на цябе ніколі нічога дрэннага сказаць — ты ж мая мама». Гэтыя словы — «ты ж мая мама» — вартыя ўсяго на свеце. Дзеля гэтага не тое што кінуць піць, дзеля гэтага можна і горы звярнуць. Калі ты сапраўды маці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Рэйтынгі

## У ПЕРШАЙ СОТНІ — ДВА БЕЛАРУСКІЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ

**Па выніках новага рэйтынгу лепшых універсітэтаў краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі, якія развіваюцца, БДУ увайшоў у ТОП-50.**

Новы рэйтынг вядомага брытанскага QS заснаваны на аналізе дзевяці крытэрыяў: акадэмічная рэпутацыя, рэпутацыя сярод працадаўцаў, суадносіны колькасці студэнтаў да колькасці супрацоўнікаў прафесарска-выкладчыцкага саставу, доля запрошаных выкладчыкаў з іншых краін, доля замежных студэнтаў, доля супрацоўнікаў з навуковай ступенню, эфектыўнасць інтэрнэт-рэсурсаў, колькасць апублікаваных артыкулаў на аднаго супрацоўніка і частата цытавання артыкулаў. Гэты рэйтынг ахоплівае 30 краін: Албанію, Арменію, Азербайджан, Беларусь, Боснію і Герцагавіну, Балгарыю, Харватыю, Чэхію, Эстонію, Венгрыю, Грузію, Казахстан, Косава, Кыргызскую Рэспубліку, Літву, Латвію, Македонію, Малдову, Чарнагорыю, Польшчу, Румынію, Расію, Сербію, Славакію, Славенію, Таджыкістан, Туркменістан, Турцыю, Узбекістан і Украіну.

Сярод 368 універсітэтаў, чыя дзейнасць была прааналізавана, БДУ заняў 38-е месца. А ўзначаліў рэйтынг Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ламаносава. За ім размясціўся Карлаў універсітэт (Чэхія), які падзяліў другое месца з Новасібірскім дзяржаўным універсітэтам. Акрамя Белдзяржуніверсітэта, у рэйтынгу прадстаўлена яшчэ адна беларуская ўстанова — Беларускі дзяржаўны нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, які трапіў у групу ВНУ, што займаюць з 61-й па 70-ю пазіцыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Не прапусціце!

## АНЁЛЬСКІМ ШЛЯХАМ ДА ХРЫСТА

**Калядная выстаўка пад такой назвай адкрылася і будзе працаваць да сярэдзіны лютага ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі.**

Анёлы невыпадкова атаясамліваюцца з Калядамі, бо менавіта яны першымі абвясцілі свету аб нараджэнні Сына Божага. Акрамя таго, Біблія сцвярджае аб існаванні ў кожнага чалавека ўласнага анёла, які спадарожнічае з ім праз усё жыццё. Таму, зразумела, выявамі анёлаў здаўна ўпрыгожваліся храмы. Некаторыя з іх (абразы і культавыя разьбяныя скульптуры з калекцый Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі і Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі) паказаны на выстаўцы «Анёльскім шляхам да Хрыста». А разам са старажытнымі творамі — і сучасныя работы на тэму анёлаў у выкананні гродзенскіх майстроў — з тканіны, паперы, саломы, металу. Мажліва, убачыўшы гэтыя вырабы, хтосьці з наведвальнікаў выстаўкі паспрабуе і сам зрабіць такога анёльчыка.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

## Студэнт года — міліцыянер

**На Магілёўшчыне выбралі пераможцу абласнога тура рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2014».**



За званне лепшага з лепшых змагаліся прадстаўнікі Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, МДУ імя А.А. Куляшова, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і Магілёўскага інстытута МУС. Удзельнікам трэба было прадставіць цікавы праект да Года моладзі, паспрачацца ў прамоўніцкім майстэрстве на тэму «Мая спецыяльнасць — мая гарантыя будучага», падрыхтаваць відэаролік на тэму «Я — студэнт!», праявіць сябе ў іншых іспытах.

Па выніках шэрагу конкурсаў і інтэрнэт-галасавання пераможцам стаў курсант Магілёўскага інстытута МУС Віктар Кураш.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ На канапе

# УСЕ АДЦЕННІ ЦУДУ ДЛЯ ЗІМОВЫХ ВЕЧАРОЎ

**Зіма для многіх — гэта перш за ўсё навагоднія святы: незалежна ад надвор'я, у душы ажывае прага цудаў. Адны праводзяць гэтыя дні ў шумнай кампаніі, іншыя — удваіх з каханым, а нехта прытрымліваецца традыцыі сустракаць святы ў сямейным коле... Які б з варыянтаў вы ні выбралі, наўрад ці атрымаецца абысціся без прагляду фільма. Прапануем вашай увазе дзясятак «незамыленых» кінастужак, якія не толькі дазволяць вам добра правесці час зімовым вечарам, але і падораць выдатны настрой, веру ў лепшае і ў казку...**

### 1. «Чацвёра Каляд» (ЗША, 2008 г.).



Амерыканская камедыя не толькі расказвае пра святкаванне Раства, але і ўздымае пытанні сямейных каштоўнасцяў. Галоўныя героі фільма — Брэд і Кэйт, якія ўжо не першы год разам. Здавалася б, ідэальная пара, але разам з тым абое супраць шлюбу і «сямейных кайданоў»... Напярэдадні чарговага Раства, калі традыцыйна сем'і збіраюцца разам, нашы героі плануюць адправіцца ў адпачынак на востраў Фіджы. Аднак з-за неспрыяльнага надвор'я ўсе авіярэйсы адмяняюцца, малады пара трапляе ў навіны, пасля чаго іх чакае чатыры паездкі на свята да родзічаў. Тады і пачынаецца самае цікавае: адносіны правяраюцца на трываласць, «шкілеты» вылазяць з шафаў, а дадайце сюды шкадлівых пляменнікаў і нечаканыя сітуацыі ў гасцях — вось і атрымаецца святочны коктэйль з гумару і рамантыкі, памножаных на атмасферу свята. Ці ўдасца героям, якіх на экране ўвасобілі Вінс Вон і Рыз Уізэрспун, вытрымаць Раство і зберагчы свае пачуцці, можна даведацца падчас прагляду фільма «Чацвёра Каляд».

### 2. «Гімн Раства» (Вялікабрытанія, ЗША, 1951 г.).

Гэты фільм, дзе спалучаюцца драма і фэнтэзі, зняў паводле аповесці Чарльза Дзікенса «Песня Раства» больш як паўстагоддзя таму Браян Дэманд Херст. Каляровая версія фільма была выпушчана ў Вялікабрытаніі толькі ў 1989 годзе. Гісторыя старога скнары Скруджа, які за адну ноч перажывае ачышчэнне: духі сучаснага і будучыні прымушаюць героя паглядзець на сябе збоку. Пасля гэтага назаўсёды змяняецца яго стаўленне да сябе і свайго жыцця... Што можа быць лепшым за павучальную гісторыю пра людскія ўзаемаадносіны ў стылі чорна-белага кіно?

### 3. «Цуд на 34-й вуліцы» (ЗША, 1994 г.).




Фільм, які можна смела прапаноўваць для прагляду ўсёй сям'і. У ім знайшлі адбітак тэма кахання, сямейных адносін, пошук адказаў на вечныя пытанні веры і наяўнасці дабра і зла ў свеце... Галоўная гераіня фільма, шасцігадовая Сюзан, расце без бацькі і не верыць у існаванне Санта Клауса. Але ўсё роўна складае спіс жаданняў, адрасаваны яму, дзе просіць пра самыя важныя падарункі: новы дом, бацьку і маленькага браціка. І цуд здараецца, калі дзяўчынка сустракаецца з сапраўдным Сантам у адным з супермаркетаў... Паглядзіце, як развіваліся падзеі потым, і, магчыма, гэтая гісторыя дазволіць і вам узгадаць прыемныя моманты з дзяцінства і зразумець, што шчаслівымі сябе і іншых робім мы самі.

### 4. «Шчаўкунок і Пацучыны кароль»

Мастацкі фільм у фармаце 3D Андрэя Канчалоўскага ўбачыў свет у 2010 годзе. Зняты ён паводле аднайменнай казкі Гофмана і балета П. Чайкоўскага. Амаль на працягу дзвюх гадзін можна разам з героямі пабыць у казцы і перажыць яркія прыгоды герояў, пераканацца чарговы раз, што дабро заўсёды перамагае зло... Толькі ўявіце: Вена 1920-х гадоў. Напярэдадні Раства дзяўчынка Мэры атрымлівае ў падарунак ад свайго дзядзькі драўляную лялльку — Шчаўкунка. Уяўленне нашай гераіні ажыўляе лялльку і пераносіць у свет дзіцячых мар, цудаў і прыгод... Там яны і сустракаюцца з Пацучыным каралём і яго злой маці, якія захапілі горад і імкнуцца знішчыць людзей у ім. Выйсце адно — змагацца!.. Узнікла жаданне правесці вечар у атмасферы прыгод і даведацца, каму ўсміхнулася фартуна ў гэтай бітве, — тады плануйце прагляд «Шчаўкунка і Пацучынага караля» для ўсёй сям'і.

### 5. «Гісторыя Раства» (Фінляндыя, 2007 г.).



Гэтая святочная казка расказвае гісторыю хлопчыка, які некалі жыў у Лапландыі. Калі ў яго загінулі бацькі, то мясцовыя жыхары вырашылі самі клапаціцца пра яго. Кожны год хлопчыка бярэ да сябе жыць новая сям'я. На Каляды Нікалас пераходзіць у іншы дом, а ўсім дзецям, з якімі жыў, дорыць самаробныя цацкі да свята ў знак удзячнасці. Аднойчы ён трапляе ў дом да старога і раздражнёнага цесляра, які забараняе яму рабіць цацкі ў падарунак. Традыцыя рабіць падарункі на Раство аказваецца пад пагрозай знікнення... Але, на шчасце, Нікалас прыдумаў, як уратаваць сітуацыю. Як яму гэта ўдалося і што змянілася ў выніку ў жыцці нашых герояў, даведаецеся з «Гісторыі Раства».

### 6. «Стары Новы год» (ЗША, 2011 г.).



Фільм у нечым нагадвае мазаіку, якая паслядоўна складваецца ў адно цэлае з гісторый усіх герояў. Дзеянне адбываецца ў Нью-Ёрку напярэдадні Новага года. Тут пераплятаюцца эпізоды з жыцця чалавека, які дажывае свае апошнія дні ў бальніцы, сакратаркі, якая вырашыла прытрымлівацца сваіх абяцанняў, прадзюсара папулярнага навагодняга шоу, які зусім не любіць гэтае свята... Фільм рэалістычна паказвае, што даецца таму, хто просіць прабачэння, што мы не самотныя, калі маем блізкіх людзей, і што любоў — гэта самы галоўны цуд і найдаражэйшы падарунак для ўсіх, асабліва на святы. Пасля прагляду вы можаце расчуліцца, але не будзеце расчараванымі.

### 7. «Сірата казанская» (Расія, 1997 г.).

Навагодняя камедыя, знятая рэжысёрам Уладзімірам Машковым, расказвае пра вясковую настаўніцу Насцю, якая вырашыла адшукаць свайго бацьку, з якім ніколі не сустракалася і наогул не ведала яго. На апублікаванае ў газеце пісьмо яе маці адгукаюцца тры мужчыны. І кожны з іх шчыра верыць, што менавіта ён з'яўляецца бацькам Насці. А 31 снежня ўсе трое прыязджаюць у дом дзяўчыны, дзе і пачынаецца высвятленне пытання, хто ж насамрэч сапраўдны бацька... Паўтары гадзіны фільма праляцяць непрыкметна, бо тут і цудоўная музыка, і захопленыя дыялогі, і выдатная ігра акцёраў, прыпраўленыя гумарам і святочным настроем. Жадаеце адчуць атмасферу



навагодняга свята ў правінцыі — тады вечар за праглядам гэтай карціны, несумненна, стане ўдалым выбарам!

### 8. «Снежнае каханне, альбо Сон у зімовую ноч» (Расія, 2003 г.).

Адна са шматлікіх варыяцый на тэму, што нічога выпадковага не бывае. Гісторыя збегу абставін, дзе каханню даецца другі шанц і ўзрост яму не перашкода. У фільме вы знойдзеце добры гумар і іронію. Галоўныя героі — Ён і Яна. Іх новая сустрэча адбываецца праз дзесяць гадоў расстання напярэдадні Новага года... Ці здолеюць яны скарыстацца другім шанцам?

### 9. «Вучань Санты» (Аўстралія, 2010 г.)



Мультфільм, які распавядае пра веру ў цуды, пераадоленне ўласных страхаў і даказвае аксіёму, што ад лёсу не ўцячэш... Усё пачынаецца, калі стары добры Санта не хоча сыходзіць на пенсію, але правілы патрабуюць, каб ён знайшоў сабе замену. Шчаслівчык, які стане новым Сантам, павінен мець імя Нікалас, чыстае сэрца і быць сіратой. І менавіта такі хлопчык будзе абраны Санта Клаусам. Яго пошук і з'яўленне ключавым момантам мультфільма. Аднак шлях станаўлення Санты не просты, бо патрабуе самаахвярнасці, жадання пераадольваць свае слабасці, каб дабіцца жаданага выніку. Раство — самае чаканае і чароўнае свята, таму самы час задумацца пра сваё прызначэнне, палічыць сапраўдных сяброў у сваім жыцці, падумаць, якіх змен для сябе хацелася б... Але спярша варта паглядзець мультфільм «Вучань Санты».

### 10. «Тры арэшкі для Папялушкі» (1973 г.).



Старая кінаказка, якая падыдзе для сямейнага прагляду зімнім вечарам. Фільм з'явіўся дзякуючы сумеснай працы Чэхаславакіі і ГДР. Ён здымаўся ў чэшскай мясцовасці Шумава, нямецкім замку Морыцбург (рэзідэнцыя караля) і ў чэшскім замку Швіхаў (дом мачахі). У аснову фільма пакладзена казка братоў Грым «Тры сястры», якую для фільма апрацавала Бажэна Немцава. Адрозненне гэтай гісторыі ад першапачатковай версіі ў тым, што Папялушка здабывае сваё шчасце не з удзелам феі-хроснай, а пры дапамозе трох чароўных арэшкаў... З горада Папялушцы прывозяць тры арэшкі, а праз нейкі час яна сустракаецца з прынцам — выпадкова, у лесе... А потым трапляе на бал у каралеўскі палац... Атрымаўшы прапанову ад прынца стаць яго нявестай, наша гераіня ўцякае... Хто дапамог прынцу адшукаць Папялушку і што робіць дзяўчыну сапраўднай прынцэсай, раскажа вам гэтая чароўная гісторыя.

**Падрыхтавала Алена ДРАПКО**

■

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

## ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ПАЗІЦЫІ

**Вядучым рубрыкі яны падрыхтаваны да маючага адбыцца спаборніцтва звяздоўскіх рашальнікаў «Пагода ў доме-11». Як заўжды, у іх белыя пачынаюць і перамагаюць:**



1. **Белыя:** a7, b4, e3, g5 (4). **Чорныя:** b2, d6, e5, g3, h6 (5).
2. **Белыя:** a5, a7, d4, e3, e5, g7 (6). **Чорныя:** b2, b4, b8, c3, f8, g5, h4 (7).
3. **Белыя:** a5, a7, d4, e3, e5, e7 (6). **Чорныя:** b2, b4, b8, c3, d8, g5, g7, h4 (8).
4. **Белыя:** a1, b6, c7, d4, g1 (5). **Чорныя:** a3, a5, b2, c3, d2, h4 (6).

### З КАЛЕКЦЫІ КАМБІНАЦЫЙ

Уладальнік бронзавага медаля сусветнага чэмпіянату па складанні малых праблем-100 Віктар Шульга працягвае **бліц-65**. Мінчанін прапануе заданне № 3 з калекцыі ўласных камбінацый на 64-клетачнай дошцы:



**Белыя:** a3, c1, d2, e7, f6, h6 (6). **Чорныя:** a5, b4, c3, c5, c7, d8, f4 (7). Выйгрыш.

◆◆◆

Адказы на працягу двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

Завяршаецца падрыхтоўка да правядзення шостага першынства свету па шашачнай кампазіцыі-100. Сёння ж паведамляем вынікі папярэдняга чэмпіянату «PWCP-V», які прайшоў у раздзеле «Вялікія праблемы і праблемы-гіганты». Чэмпіёнам стаў В. Моркус (Літва), віцэ-чэмпіёнам — С. Перапёлкін (Расія), бронзавы медаль заваяваў наш зямляк У. Матус, які пераехаў у Маскву. У дзясятку наймацнейшых увайшлі і суайчыннікі П. Шклудаў (6-е месца), Р. Краўцоў (7-е), В. Шульга (9-е) і А. Сапегін (10-е). З іх прызавыя месцы занялі: у катэгорыі A — Р. Краўцоў (3-е) і Б. Іваноў (9-е), катэгорыі C — Р. Краўцоў (10-е) і катэгорыі D — П. Шклудаў (2-е).

Разбярыце канструкцыю 16 на 14 Пятра Шклудава (Наваполацк):

**Белыя:** 17, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 27, 30, 31, 34, 35, 40, 41, 44, 47 (16). **Чорныя:** 2, 8, 12, 13, 16, 18, 28, 29, 32, 33, 38, 39, 43, 45 (14). 87 ачкоў па змесце: 204, 24, 350, 29, 42, 7, 4, 49, 25, 39 (45) 50#.

### РАШЭННІ

**Бліц-65/1** (В. Шульга): d6, h8, a1, a7 (e1) f2 (c3) d2, h4, f2x.

## ПЯТНІЦА, 9 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05 Серыял «Шчаслівчык Пашка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «На шляху да сэрца».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 23.35 Серыял «Сваты 5».**
**17.25** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**17.55** Нашы.
**18.10** «Вялікі рэпартаж».
**19.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** «Зорнае жыццё». «Татыадзіночкі».
**21.00** Панарама.
**21.45** Цырымонія ўручэння прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп».
**23.20** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 15.20 Серыял «Сашка».**
**10.10** Капейка ў капейку.
**10.45 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.45** «Сустрэча з...» Іван Вабішчэвіч.
**12.40 Серыял «Універ».**
**14.45** Вось гэта дзіва!
**16.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Спрынт. Жанчыны.
**17.55 Серыял «Таксі».**
**19.00 Баявік «Фантастычная чацвёрка».**
**20.55** Цела чалавека.
**21.25** КЕНО.
**21.35** «Бітва экстрасэнсаў». Заключны выпуск.
**23.00** Рэпарцёр.
**23.50 Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 23.25** «Галасы з мінулага». Да 125-годдзя чэшскага пісьменніка Карэла Чапека.
**8.10 «Лес». Драма.**
**9.40, 17.05** «Песні навагодніх начэй». Выпуск трэці. 50-я гады.
**10.05 «Кар'ера Дзімы Горына». Камедыя.**
**11.40** «Першапраходцы Далёкага Усходу». «Іван Масквіцін. Шлях да акіяна».
**12.35** «Сіла веры».
**13.00** «Аўтограф». Тэатр танца «Прэм'ер-Спонайд» Палаца культуры ААТ «Полацк-Шкловалакно».
**13.25 «Гусарская балада». Камедыя.**
**14.55** Прэм'ера «Музеі Беларусі». Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж».
**15.55** «Канёк Гарбунок». М/ф.
**17.30** П.І. Чайкоўскі. «Лебядзінае возера». Спектакль Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра балета імя Леаніда Якабсона.
**19.35** «Там, у нас». Прытча.
**20.45** Калыханка.
**21.05** «Песні навагодніх начэй». Выпуск чацвёрты. 60-я гады.
**21.30 «Бітлз». Дапамажы-це!». Камедыя.**



**23.00** «Камертон». Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Лілія Батырава.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 0.35** PRO спорт. Навіны.
**8.00, 13.30, 17.30, 21.35** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен. Паўфінал.
**10.10** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Слован» (Браціслава).
**12.20** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**12.55** Фактар сілы.
**15.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Эстафета. Мужчыны.
**17.05** Авертайм.
**19.35** Піт-стоп.
**20.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Спрынт. Жанчыны.
**23.40** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «200 гадоў Кубанскаму казацкаму хору».
**10.00** «Савелій Крамараў. Джэнтльмен удачы».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Балабон».**
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.05** «Сам-насам з усімі».
**15.05** «Алёна Апіна «А каханне яно і ёсць...».
**16.15** «Ніна Сазонава. І сум у яе вачах».
**17.00** «Поле цудаў».
**18.20** «Агадай мелодыю».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Адліга».**
**23.15 Фантастыка «Чужы».**
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 22.00** «Глядзець усім!».
**6.35** «Нам і не снілася»: «Грандыёзны мужчынскі падман».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**7.45, 16.55** «Далёкія сваякі».
**8.00** «Зорны рынг. Навагодняя бітва хітоў «Назад у 90-я!».
**9.00** «Добры дзень, доктар».
**9.35** «Дарагая перадача».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 13.50, 16.50** «Гарады, якія спяваюць».
**10.45, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.55 Фантастыка «Падарожжа да цэнтра Зямлі».**
**15.35** «Татальны распродаж».
**18.35** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».**
**23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**0.15** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**1.00 Серыял «Падкідны».**

### МІР

**6.00** М/ф.
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава».**
**12.20 Маст. фільм «Сувязь».**



**13.50 Маст. фільм «Мумія: Прынц Егіпта».**
**16.15, 3.35 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў міс Фрайні Фішэр».**
**18.05, 1.40 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**19.15 Серыял «Адлюстраванне».**
**22.10 Маст. фільм «Зноў адзін на ўсіх».**
**2.35 Серыял «Чорны пакой».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** М/ф.
**7.30 Маст. фільм «Камінны госць».**
**9.10 Камедыя «Памылкі кахання».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** Святочны канцэрт.
**12.55** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.35** Навіны — Беларусь.
**14.15 «ХА». Маленькія камедыі.**
**14.40, 17.00 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**20.35** «Аншлаг і Кампанія».
**22.45 Маст. фільм «Я буду чакаць цябе заўсёды».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25, 8.20 Серыял «Гончыя».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**9.10 Серыял «Дарожны патруль».**
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**12.05, 13.20 Серыял «Псеўданім «Албанец».**
**15.50** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.20 Серыял «Павуцінне».**
**22.50 Маст. фільм «Настаяцель-2».**
**0.25** «Бульдог-шоу».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.15, 19.40, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 15.10** Мультпарад.
**7.30 Камедыя «Джэнтльмены поспеху».**
**9.10** «Тэлемагазін».
**9.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**10.30, 19.25** «Кінаблакнот».
**11.00 Камедыя «Па сямейных абставінах».**
**13.25 Серыял «Чарцяня».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.05** Дак. фільм «Выходжу адзін я на дарогу».
**17.30 Серыял «Эўрыка».**
**18.30 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».**
**19.45 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Мексіканец».**
**23.15 Серыял «Прыгарад».**

### ВТВ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00, 1.00** Серыял «Тарыф на мінулае».
**10.00, 3.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**10.30, 20.00** Скетчком «Сям'я 3D».
**12.00** Фэнтэзі «Колер чараўніцтва». 2-я серыя.
**14.15, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Баявік «Ямакасі, або Новыя самураі».
**18.30** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Фанфан-цюльпан».
**0.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Навіны культуры.
**10.20** Канікулы! «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.
**12.35** Іграе Арсеній Шульгін.
**13.40** «Марына Няёлава. Гэта было. Гэта ёсць... Фаіна Ранеўская».
**14.35** «Брадвей. Гісторыя ў асобах і танцах». Дак. серыял.
**15.05, 1.55** «Пінгвіны скрытай камерай». Дак. серыял.
**16.00** Праект года-2014. Вялікая опера.
**17.45** Кіно+тэатр. Дзмітрый Назараў у фільме-спектаклі «Абанент часова недаступны».
**18.55** Стас Намін і група «Цветы». Юбілейны канцэрт.
**20.15** «Марына Няёлава. Гэта было. Гэта ёсць... Ніна Дарошына».
**20.40** «Яны сустрэліся ў дарозе». Маст. фільм.
**22.05** «Сусветныя скарбы культуры».
**22.20** «Лінія жыцця». Кацярына Гусева.
**23.15** «Шлюб караля Густава III». Маст. фільм. 2-я серыя.
**0.45** «Шукальнікі». «Хто ты, «Чортаў горад»?»
**1.30** «Шэры воўк энд Чырвоная шапачка». М/ф для дарослых.
**2.50** «Франсіска Гоя». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 0.00** Маст. фільм «Кароткія гісторыі».
**6.45** «Бенефіс Савелія Крамарава». Фільм-канцэрт. 1974 год.
**7.30** Маст. фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».
**8.40** «А трынаццатай гадзіне ночы». Фільм-канцэрт. 1969 год.
**10.00, 16.00, 3.45** «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
**11.00, 4.45** «Калядныя сустрэчы». 1993 год.
**12.05** «Свет сустракае Новы год». 1978 год.
**12.50** «Будзільнік». «Навагодняя прыгоды капітана Врунгеля». 1985 год.
**13.25, 20.35, 1.10** Канцэрт замежнай эстрады.
**13.50, 19.30** Маст. фільм «Саламяны капялюшык».
**15.00, 20.55** «Навагодняе святочнае прадстаўленне». 1987 год.
**17.00, 23.00** «Шырэй круг». Навагодняя праграма. 1987 год.
**18.00** «КВЗ-90». Навагодні выпуск.
**18.50** «Навагодняя забаўляльная праграма».
**22.00** «Колба часу». «Любімая савецкая песня пра зіму».
**0.50** «Бамонд». 1992 год.
**1.40** Маст. фільм «Пра Чырвоную Шапачку». 2-я серыя.
**2.50** «Песня-86». 2-я частка.

### EUROSPORT

**3.00, 20.25, 1.00** Ралі. Ралі-рэйд. Дакар.
**10.30, 2.30** Ралі. Ралі-рэйд.
**10.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**11.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета.
**12.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**16.00, 1.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**17.45** Тэніс. Турнір АТР.
**20.30** Дартс. Чэмпіянат свету.
**0.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**2.45** Аўта- і матаспорт.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.10, 14.30, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Сваты 3».
**6.55** Меладрама «Замерзлая з Маямі».
**8.30** Камедыя «Мільён на Раство».
**10.55** Камедыя «Горка».
**12.35, 15.15, 17.05, 18.20, 19.55, 21.40, 22.50, 0.40, 2.55** Скетчком «Паміж намі».
**12.55** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**15.40** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе».
**18.35** Камедыя «Свята пад замком».
**20.20** Камедыя «Калядная пяцёрка».
**23.10** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**1.15** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
**4.00** Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00, 14.15** «Доктар І.».
**8.30, 19.00, 1.10** Серыял «Каханне і пакаранне».
**9.55, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.40, 18.05** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 16.40** «Шчырая размова».
**13.20** Серыял «Аўрора».
**14.45, 0.25** Серыял «Каменская».
**15.40, 22.15, 2.25** «Зорныя гісторыі».
**17.35, 3.55** «Простыя складанасці».
**20.30** Камедыя «Фанфан-цюльпан».
**23.10** «Гісторыі выратавання».
**23.40** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.20** Камедыя «Мільён для чайнікаў».
**8.15** Камедыя «Замуж на 2 дні».
**10.15** Камедыя «Па прыкметах сумяшчальнасці».
**12.00** Трылер «Філосафы: Урок выжывання».
**14.00** Камедыя «Лак для валасоў».
**16.00** Меладрама «Цяпер самы час».
**18.00** Трылер «Ілюзія падману».
**20.00** Трылер «Прэстыж».
**22.15** Баявік «Прылады смерці: Горад касцей».
**0.30** Камедыя «Поўнач у Парыжы».
**2.05** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
**4.00** Трылер «Суіні Тод, дэман-цырульнік з Фліт-стрыт».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
**8.10** Камедыя «Кіндэр-Вілейскі прывід».
**10.10** Фантастыка «Цёмны свет: Раўнавага».
**12.00** Камедыя «Сябры сяброў».
**13.40** Драма «Жанаты халасцяк».
**15.20** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**16.50** Меладрама «Паралельныя светы».
**18.30** Баявік «Спіраль».
**20.20** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**21.50** Камедыя «Дзед 005».
**23.30** Прыгоды «Джунглі».
**1.00** Драма «Агні прытона».
**3.00** Меладрама «Перцы».
**4.50** Прыгоды «Грэчаскія канікулы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.40** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.30, 10.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50, 12.40** Зрабі або памры.
**8.10** Звярыны патруль.
**8.55** Шаша праз пекла.
**9.40, 14.15, 19.30** Дыстанцыйнае выжыванне.
**10.30, 14.55, 20.15** Золата Юкана.
**11.10** Машыны: разабрацьі прадаць.
**11.55, 18.45** Скарбашукальнікі.
**15.40** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.30** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.10** Горшае надвор'е ўсіх часоў?
**18.00, 3.00** Апакаліпсіс. Першая сусветная вайна.
**21.00, 0.50, 3.45** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**22.30, 5.15** Аферысты і турысты.
**23.15** 80-я: Найвялікшыя футбольныя моманты.
**0.00, 2.20** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Як уладкаваны Сусвет.
**9.40, 13.50** Што ў вас у гаражы?
**12.10** У пагоні за выгадай.
**13.00, 7.05** Золата джунгляў.
**14.40, 6.05** Трой.
**16.20, 4.25** У пагоні за класікай.
**17.10, 19.15, 21.20** Багажныя войны.
**22.10** Як пабудаваць суперкар.
**23.00** Скануючы неба.
**23.50** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.
**0.40, 3.35** Каралі аўкцыёнаў.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**5.15** Махінатары.

## СУБОТА, 10 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.45** Існасць.
**7.10 Меладрама «Снежны анёл».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 23.25 Серыял «Каханне ў вялікім горадзе-3». 1-я серыя.**
**10.50** «Пра ежу!».
**11.25** Кулінарная дыпламатыя.
**12.10** Гісторыі рамонту.
**12.50** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.30** БеларусьLIFE.
**14.00** «Зорнае жыццё». «Нарадзіць любой цаной».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30, 0.30** «Вялікая розніца».
**17.10 Дэтэктыў «Школа для таўстушак».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Камедыя «Ноч зачыненых дзвярэй».**
**0.20** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00 Меладрама «Карнавал».**
**9.40** Беларуская кухня.
**10.15, 21.15** Тэлебарометр.
**10.20, 21.20 Серыял «Інтэрны».**
**11.50** Капейка ў капейку.
**12.25** «Бітва экстрасэнсаў». Заключны выпуск.
**13.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Спрынт. Мужчыны.
**15.20** Вось гэта дзіва!
**15.55** «Comedy Батл». Без межаў».
**17.00** «Comedy woman».
**18.05** Ікра.
**19.15** Ваша лато.
**19.40** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.55** «Разбуральнікі міфаў».
**20.10** Спортлато 6 з 49.
**21.05** КЕНО.
**22.50** «Сустрэча з...» Марына Мулявіна.
**23.25 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 14.35, 17.35, 0.25** «Галасы з мінулага». Кулямётчык 936-га стралковага палка Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі.
**8.10** «Там, у нас». Прытча.
**9.20** «Камертон». Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Лілія Батырава.
**9.45** «Песні навагодніх начэй». Выпуск чацвёрты. 60-я гады.
**10.10** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**10.40** «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Зімовы калейдаскоп.
**11.45 «Дзень добры і бывай!». Меладрама.**
**13.15 «Як выйсці замуж за караля». Фільм-казка.**
**14.40** Прэм'ера. «Музеі Беларусі». Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.
**15.35** «Русь былинная». Канцэрт казачага ансамбля «Атаман».
**17.10** «Дыя@блог P.S.»
**17.45 «Вікторыя і Альберт». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.20** «Песні навагодніх начэй». Выпуск пяты. 70-я гады.
**21.50 «Пасажыр пад даждом». Драма.**
**23.40** «Спіс Кісялёва». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен. Паўфінал.
**10.00** Піт-стоп.
**10.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Спрынт. Жанчыны.
**12.00** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен. Фінал.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**14.55** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Лакаматыў-Кубань».
**16.55** Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Дынама» (Мінск).
**19.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Спрынт. Мужчыны.
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Тотэнхэм».
**22.25** Формула-Е. Гран-пры Аргенціны.
**23.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Ньюкасл».
**1.25** Еўрапейскі покерны тур.
**2.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Манчэстэр Сіці».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** «Ералаш».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.10** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00 Камедыя «Як выкрасці мільён».**
**15.30, 16.20 Драма «Тытанік».**



**16.15, 20.55** Навіны спорту.
**19.30** «Чорна-белае».
**21.00** «Сёння вечарам».
**22.50** «Легенды Live».
**23.30** «Што? Дзе? Калі?». Фінал года.

### СТБ

**6.25 Серыял «Студэнты 2».**
**7.15** «Анфас».
**7.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».**
**9.05** «Чыстая праца».
**10.00** Іншая краіна. «Казахстан. Дзе юрты суседнічаюць з хмарачосамі».
**10.50, 13.40, 16.45** «Гарады, якія спяваюць».
**10.55** «Гэта мой дом».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.45** «Ваенная тайна».
**14.45 Серыял «NEXT».**
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Вялікі горад».
**17.30** «Дзіўная справа».
**18.30** «Разумней не прыдумаеш».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».**
**22.00** «Ежа багоў».
**23.00** «Глядзець усім!».
**0.20 Серыял «Падкідны».**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.45** «Зямля і неба».
**8.10** «Саюзнікі».
**8.35** «Сабака ў доме».
**9.05** «Скажыце, чаму?».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.45, 23.45 Маст. фільм «Беражыся аўтамабіля».**
**12.25 Серыял «Зноў адзін на ўсіх».**
**16.15 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў міс Фрайні Фішэр».**
**22.05 Маст. фільм «Эфект даміно».**
**1.25** «Любімыя акцёры».
**1.55 Маст. фільм «Залезь на Месяц».**
**3.30 Серыял «Чорны пакой».**
**5.00 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**7.45 Серыял «Хтосьці губляе, хтосьці знаходзіць».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** «Суботнік».
**11.50** «Планета сабак».
**12.20 Маст. фільм «Залатыя нажніцы».**
**14.15 Серыял «Мора па калена».**
**16.05** «Мая планета».
**17.10** « Гэта смешна».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.35** «Новая хваля». Юбілейны вечар Алы Пугачовай.
**23.25** «Навагодні парад зорак».
**1.20 Маст. фільм «Снягурка для дараслага сына».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00 Серыял «Гончыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Галоўная дарога».
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Паедзем, паядзім!».
**13.55 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.20 Серыял «Павуціннe».**
**22.50 Мюзікл «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.50, 19.00, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**9.15 Камедыя «Як важна быць сур'ёзным».**
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Камедыя «Па першым клічы», 1-2-я серыі.**
**12.55 Маст. фільм «Мексіканец».**
**15.30** «Тэлемагазін».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.35 Камедыя «Паміж небам і зямлёй».**
**18.10 Серыял «Эўрыка».**
**19.05 Камедыя «Ой мароз, мароз».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Версія».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 19.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** Серыял «Тарыф на мінулае».
**10.00, 18.05** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**10.30, 20.00** Скетчком «Сям'я 3D».
**12.30** Меладрама «Стань мной».
**14.30, 23.45** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Камедыя «Фанфан-цюльпан».
**18.30** «Лаві момант».
**21.10** Прыгоды «Сахара».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** «Людзі ХЭ».
**2.00** «Турбаміксер».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** Канікулы! «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.
**12.45** Вялікая сям'я. Алеся Жалязняк.
**13.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.55** Гітара сямiструнная. «Аляксандр Вярцінскі. Мне патрэбна толькі тэма...».
**14.35** «Брадвей. Гісторыя ў асобах і танцах». Дак. серыял.
**15.05, 1.55** Краіна птушак. «Совы. Дзеці ночы». Дак. фільм.
**16.00** Праект года-2014. Вялікая опера.
**17.55** Кіно+тэатр. Яфім Шыфрын у фільме-спектаклі «П'еса для мужчыны».
**18.50** «Аркадскія пастухі» Нікала Пусена». Дак. фільм.
**18.55** «Рамантыка рамансa». «Зіма».
**19.55** Юбілей Валянціны Цялічкінай. «Астравы».
**20.35** «Пяць вечароў». Маст. фільм.
**22.20** «Лінія жыцця». Яўгенія Дабравольская.
**23.15** Кіно на ўсе часы. «Хэлоў, Долі!» Маст. фільм.
**1.40** «32 снежня». М/ф для дарослых.
**2.50** «Шарль Кулон». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Свет сустракае Новы год». 1978 год.
**6.50** «Будзільнік». «Навагоднія прыгоды капітана Врунгеля». 1985 год.
**7.25, 14.35, 23.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**7.50, 13.30** Маст. фільм «Саламяны капялюшык».



**9.00, 14.55** «Навагодняе святочнае прадстаўленне». 1987 год.
**10.00, 3.55** «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
**11.00, 17.00** «Шырэй круг». Навагодняя праграма. 1987 год.
**12.00** «КВЗ-90». Навагодні выпуск.
**12.50** «Навагодняя забаўляльная праграма».
**16.00** «Колба часу». «Любімая савецкая песня пра зіму».
**18.00** «Вясёлыя ноткі. На балі ў Папялушкі». 1991 год.
**19.15** «Выкраданне». 1-я серыя. Навагодні фільм-канцэрт. 1969 год.
**20.50** «Навагодні атракцыён». 1-я частка. 1984 год.
**22.20** Маст. фільм «Начныя забавы». 1-я серыя.
**0.00** Маст. фільм «Кароткія гісторыі». 3-я серыя.
**0.45** «Бенефіс Савелія Крамарава». Фільм-канцэрт. 1974 год.
**1.30** Маст. фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».
**2.40** «А трынаццатай гадзіне ночы». Фільм-канцэрт. 1969 год.
**4.55** «Калядныя сустрэчы». 1993 год. 2-я частка.

### EUROSPORT

**3.00, 20.10, 1.00** Ралі. Ралі-рэйд. Дакар.
**10.30, 2.30** Ралі. Ралі-рэйд.
**10.45** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**11.30, 16.00, 0.00, 2.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**12.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**13.45, 1.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**15.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**18.00** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**19.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**20.15** Дартс. Чэмпіянат свету.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Сваты 3».
**6.50** Камедыя «Мільён на Раство».
**8.30** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**10.45, 12.30, 14.10, 15.15, 17.05, 18.20, 19.55, 21.40, 22.50, 0.45, 2.45, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**11.05** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе».
**12.55** Камедыя «Свята пад замком».
**15.35** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**18.30** Камедыя «Калядная пяцёрка».
**20.20** Камедыя «Я буду дома да Раства».
**23.10** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**1.15** Камедыя «Горка».
**4.05** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.15** «Свая праўда».
**11.10** «Хронікі маскоўскага быту».
**11.55** «Гісторыі выратавання».
**12.30, 0.20** Серыял «Адэсамама».
**18.45** «Даўно не бачыліся!».
**20.00** Меладрама «Аддам жонку ў добрыя рукі».
**21.40** Фільм жахаў «Праклятая».
**23.30** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.00** Драма «Мушкецёры».
**8.00** Фэнтэзі «Змярканне. Сага. Світанне: Частка 1».
**10.00** Фэнтэзі «Змярканне. Сага. Світанне: Частка 2».
**12.00** Камедыя «Каляды з няўдачнікамі».
**13.50** Трылер «Прэстыж».
**16.10** Фільм жахаў «Жанчына ў чорным».
**18.00** Драма «Ромавы дзённік».
**20.00** Трылер «Стэлс».
**22.00** Фантастыка «Выходны код».
**23.45** Трылер «Суіні Тод, дэман-цырульнік з Фліт-стрыт».
**1.45** Камедыя «Сем псіхапатаў».
**3.45** Драма «Маленькія жанчыны».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** М/ф «Смяшарыкі. Пачатак».
**8.00** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
**9.40** М/ф «Як злавіць пяро Жар-Птушкі».
**11.30** Камедыя «Год цяля».
**13.00** Прыгоды «Грэчаскія канікулы».
**14.30** Прыгоды «Рыжык у Залюстаркоўі».
**16.40** Камедыя «Горка!».
**18.30** Камедыя «Хлопец з Марса».
**20.20** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**22.00** Трагікамедыя «Шалёная дапамога».
**0.00** Драма «Дуброўскі».
**2.20** Прыгоды «Вострaў шанцавання».
**4.10** Мюзікл «Папса».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.40** Скарбашукальнікі.
**7.30** Паядынак непераможных.
**8.10** Гульні розуму.
**8.35** Займальная навука.
**8.55** Навуковыя недарэчнасці.
**9.20, 18.00** Зрабі або памры.
**9.40** Космас. Прастора і час.
**10.30** Зямля з космасу.
**11.10** Навука будучыні.
**11.55** Больш чым фокусы.
**12.40, 16.30** Кіраванне натоўпам.
**10.30** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.15** Паветраныя асы вайны.
**14.55** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**15.40** Жанчына, выхаваная малпамі.
**17.10** Гульня ў лікі.
**21.00, 0.50, 3.45** Расследаванні авіякатастроф.
**22.30, 2.30** Эвакуацыя Зямлі.
**23.15, 3.00** Уваранне на Зямлю.
**0.00, 5.15** З пункту гледжання навукі.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.15** Легендарны аўтамабіль.
**8.50, 15.30** Хуткія і гучныя.
**9.40, 16.20, 6.05** Мяцежны гараж.
**10.30** Стальныя мышцы.
**11.20** Акварыумны бізнес.
**12.10, 23.00** Дамы на дрэвах.
**13.00, 4.00** Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
**13.50** Склады.
**14.40** Дарога да прыбытку.
**18.00, 19.40, 21.20, 22.35** Портэр-Рыдж.
**23.50** Эфект Карбанара.
**0.40** Скануючы неба.
**1.30** Голыя і напалоханыя.
**2.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**3.10** Як пабудаваць суперкар.
**4.50** Маланкавыя катастрофы.
**7.05** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.

---

## Справы жыццёвыя

### НАВУКОЎЦЫ: мужчыны дурнейшыя за жанчын

**Здаецца, радасці жанчын няма мяжы. Амерыканскія навукоўцы правялі даследаванне і высветлілі, што моцная палова чалавецтва паводзіць сябе на 90% дурней за прыгожую!**



У сваім сёлетнім калядным даследаванні пад працоўнай назвай «Прэмія Дарвіна: галоўныя адрозненні палоў у ідыёцкіх паводзінах» навукоўцы прыйшлі да высновы, што мужчыны значна дурнейшыя за жанчын. Яны вывучылі звесткі пра лаўрэатаў прэміі Дарвіна за 20 гадоў, у перыяд з 1995-га па 2014 год. Высветлілася, што прэмія, якая штогод уручаецца людзям, якія памерлі самым дурным спосабам і пазбавіліся магчымасці ўнесці ўклад у генафонд чалавецтва, часцей за ўсё ўручалася мужчынам.

Аналітыкі назвалі ідыёцкай рызыку, пры якой становчая аддача ад пэўных дзеянняў настолькі малая, што вынік аказваецца заўсёды сумным і фатальным. У артыкуле гаворыцца, што «выжывае на аднаго ідыёта менш». З 318 намінантаў узнагарода дасталася ўсяго 36 жанчынам, паведамляе British medical journal BMJ.

### ЧАЛАВЕЦТВА НА ПАРОЗЕ МАСАВАГА ПУСТЭЛЬНІЦТВА?

**У перадавых краінах свету набірае сілу мода на пустэльніцтва, што выяўляецца ў рознага роду крайнасцях кшталту даўншыфтынгу (амаль поўнай адмовы ад сацыяльнага жыцця, існавання толькі для сябе), уцёкаў у віртуальную прастору ці нечага іншага. Пакуль эксперты спрачаюцца, добра гэта ці дрэнна, усё больш прадстаўнікоў «залатога мільярда» сыходзяць у «манастыр уласнага духу».**

Асабліва ярка гэтая мода праявілася ў Японіі, дзе для адпаведнага ладу жыцця нават прыдумалі свой тэрмін «хікікаморы». У перакладзе з японскай гэта гучыць як «знаходжанне ў адзіноце». Носьбітаў светапогляду называюць папросту — «хікі». Яны адмаўляюцца ад публічнага жыцця і шукаюць максімальнай адзіноты. Як вынік, такія людзі не маюць працы і жывуць на ўтрыманні сваякоў.

Адзін з варыянтаў класічнай схемы такі: бацька, напрыклад, навязвае сыну выбар прафесіі, патрабуе, каб той пайшоў па яго слядах. А малады чалавек хоча стаць мастаком і на ўгаворы не паддаецца. Не маючы магчымасці ажыццявіць свае ўласныя планы, ён у выніку аддае перавагу зусім не рабіць ніякага выбару: замыкаецца ў сваім пакоі, начамі сядзіць у інтэрнэце, днямі спіць, есць тое, што прыгатуе спагадлівая мама, і зусім не хоча пакідаць зону камфорту. Бацькі разводзяць рукамі, але што рабіць, не ведаюць. Хоць Японія з-за цэлага шэрагу асаблівасцяў амаль ідэальная краіна для «хікі», падобныя сацыяльныя паводзіны фіксуюцца і ў іншых краінах свету. У Расіі, напрыклад, гэта спакон веку прынята называць «абломаўшчынай». Але, як пустэльнікаў ні назаві, а ва ўсіх варыянтах гаворка ідзе аб вострай сацыяльнай самаізаляцыі, якая мае даволі абмежаваны набор прычын.

• Тэорыя пра найбольш «годных і шчасных жыхароў» Зямлі, якія павінны застацца на планеце, таму што жыццёвых рэсурсаў хопіць толькі на такую колькасць людзей. Другі, менш распаўсюджаны варыянт: на мільярд найбольш «прасунутых» прадстаўнікоў чалавецтва павінны працаваць усе астатнія, забяспечваючы эліце камфортнае існаванне.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**




*Хачу сказаць ўсім*
*юным і старым*
*Вандроўнікам,*
*шукальнікам прыгод:*
*Мана, што ўсе шляхі*
*вядуць у Рым, —*
*Яны заўжды вядуць*
*у новы год.*

*Я не шукаў ніколі*
*простых шлях,*
*На ростанях не ведаў*
*ціхіх сноў,*
*Губляў кірунак*
*у ліхіх снягах*
*І ўсё ж — у новы год*
*прыходзіў зноў.*

*Дарогі прывядуць*
*да брамы той,*
*Дзе ў новы дзень*
*ты зробіш першы крок.*
*Там снежань*
*развітаецца з табой,*
*А студзень скажа:*
*«Уваходзь, браток!»*

# ДЗІЦЯЧЫЯ АТРАКЦЫЁНЫ... НА ПОШЦЕ

## У новы год навагрудскія паштавікі ўвайшлі разам з абноўленым аддзяленнем паштовай сувязі

Пасля рэканструкцыі, якую выканалі спецыялісты філіяла №4 ААТ «Белрамбудсувязь», значна павялічылася плошча залы для абслугоўвання кліентаў. Прычым паклапаціліся нават пра самых малодшых наведвальнікаў: пакуль іх бацькам аказваюцца тыя ці іншыя паштовыя паслугі, дзецям прапануюцца атракцыённыя забавы. А адна з навінак для работнікаў аддзялення — душавая кабіна, якой можна скарыстацца падчас перапынку ці пасля завяршэння працоўнага дня.

— Мы імкнёмся, каб у пошты з'яўлялася больш сяброў і яны з радасцю ішлі да нас па неабходныя паслугі, — зазначае **дырэктар Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Іван ПРАТАСЕВІЧ.**

Канкрэтныя крокі ў гэтым кірунку робяцца і будуць рабіцца надалей у розных рэгіёнах Гродзеншчыны. Нядаўна, напрыклад, мадэрнізаваны будынкі раённага вузла паштовай сувязі ў Мастах і аддзялення паштовай сувязі ў вёсцы Жытомля Гродзенскага раёна.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# «ЧАСАМ НЕ ХАПАЕ СІЛ, АЛЕ МЫ НЕ МОЖАМ ПАКІНУЦЬ СВАІХ БАБУЛЬ»

## Пажылыя валанцёры дапамагаюць старым справіцца з адзінотай

**У Мінску ўжо не першы год рэалізуецца праект «Пажылыя — старым». За дзвюма тысячамі пенсіянераў, якія страцілі навыкі самаабслугоўвання і па розных прычынах не выходзяць з дому, прыглядаюць больш за 500 валанцёраў. Паколькі ў сталіцы расце колькасць старых і па-ранейшаму не хапае сацыяльных работнікаў, тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання толькі рады дапамозе добраахвотнікаў з ліку пажылых людзей. Мы сустрэліся з валанцёрамі атрада «Клопат» Партызанскага раёна, каб даведацца, як яны падтрымліваюць мясцовых пенсіянераў і ці лёгка ім, самім ужо не юным, дапамагаць старэйшым.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Раіса Пятроўна (справа) і Вольга Валянцінаўна разглядаюць фотаздымкі маладой Раечкі (так сябе называе сама пенсіянерка).

### ПУСЦІЦЬ У СВАЁ ЖЫЦЦЁ І КВАТЭРУ

Вольга Пуцінцава, якая цяпер узначальвае атрад «Клопат», пачала займацца валанцёрствам чатыры гады таму.

— Калі паступова зыходзяць з жыцця твае сяброўкі, страчваеш родных, разумееш, наколькі страшна застацца аднаму. Таму я і падтрымліваю нашых бабуль, — кажа жанчына, якой самой ужо за 70.

Па адукацыі Вольга Мікалаеўна медык і педагог, доўгі час працавала загадчыцай дзіцячага садка. Сваю валанцёрскую справу яна пачала з таго, што правяла сярод знаёмых рознага ўзросту апытанне: як яны ставяцца да старых людзей, якія стэрэатыпы наконт пенсіянераў замацаваліся ў грамадстве? Адказы збольшага былі негатыўнымі. Моладзь пісала, што старыя бурклівыя, незадаволеныя. Ды і самі пенсіянеры, якія запаўнялі анкеты, бачылі сябе абузай, не лічылі сваё жыццё цікавым і не імкнуліся яго такім зрабіць.

— Мне хацелася неяк змяніць такі настрой, — тлумачыць Вольга Мікалаеўна, — аб'яднаць нашых самотных бабуль, каб яны маглі кантактаваць паміж сабой. Мы збіраемся і абмяркоўваем кнігі, слухаем вершы. Купляем па асобніку розных часопісаў і газет, а потым абмяньваемся. Займаемся рукадзеллем: вучым адзін аднаго таму, што самі ўмеем. Рыхтуем падарункі да свят. Адной з падапечных, напрыклад, звязалі тапкі і цёплы шалік.

Валанцёркі (іх у атрадзе «Клопат» шэсць чалавек) прыносяць старым прадукты на дом, суправаджаюць жанчын на культурныя мерапрыемствы, наведваюць іх у бальніцы. Так, пенсіянеры Марыі Іванаўне дапамаглі зрабіць рамонт у кватэры.

— Суседзі зверху былі затапілі яе, у кухні пабелка са столі асыпалася. Мы пачалі рамонт з кухні, а потым і астатнія пакоі захапілі. Вядома, не самі ўсё рабілі, нанялі рабочых. З грашыма дапамог тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання. Разумееце, у нашым узросце задумаць рамонт — гэта сапраўдны подзвіг, — усміхаецца Вольга Пуцінцава.

Іншую падапечную, 93-гадовую бабулю, валанцёры завялі ў паліклініку, каб паставіць бясплатныя зубныя пратэзы. Вольга Мікалаеўна ўзгадвае, як гэтай жанчыне хацелася паесці мяса, але, з-за таго, што яго цяжка жаваць, прыходзілася абмяжоўвацца сасіскамі ці варанай каўбасой. Тады валанцёрка адварыла дома кавалачак мяса, здрабніла яго ў блендары, прыправілі спецыямі і аднесла пакаштаваць бабулі. Пенсіянерцы так спадабалася страва, якая, у прамым сэнсе, была па зубах, што на наступны дзень яна з Вольгай Мікалаеўнай схадзіла ў краму і набыла сабе блендар.

Аднак часцей старым, многія з якіх не маюць блізкіх, патрэбна не матэрыяльная, а псіхалагічная падтрымка. Валанцёры размаўляюць з пенсіянерамі, суцяшаюць іх. Часам, праўда, бывае складана наладзіць кантакт: не ўсе хочуць выходзіць з зоны камфорту, пускаць незнаёмых людзей у сваё жыццё і кватэру. Тая 93-гадовая бабуля ніколі не запрашае да сябе, а калі хоча пагаварыць, прыходзіць у госці да валанцёркі.

Дарэчы, пакуль мы размаўлялі, Вользе Мікалаеўне патэлефанаваў хтосьці з падапечных. Расхваляваная жанчына расказала, што пасварылася з сынам, прасіла валанцёрку тэрмінова зайсці да яе, каб пагаварыць. Сама Вольга Мікалаеўна лічыць, што дапамога павінна быць кваліфікаванай, таму чытае псіхалагічную літаратуру. Разам з другімі жанчынамі з атрада наведвала курсы пры Чырвоным Крыжы па аказанні дапамогі хворым і псіхалагічнай падтрымкі людзям у крызісных сітуацыях. А таксама навучылася карыстацца камп'ютарам і лічбавым фотаапаратам — каб не адставаць ад жыцця.

### УСПАМІНЫ І ЧАКАННЕ

З іншай валанцёркай атрада «Клопат», Вольгай Матвеевай, мы ідзём наведаць адну з мясцовых бабуль. Па дарозе Вольга Валянцінаўна расказвае, што ў гэтай жанчыны некалькі гадоў таму адразу загінулі муж, дачка і зяць. З родных застаўся толькі ўнук. Рэчы, што захаваліся ад памерлых блізкіх, самотная пенсіянерка прымаць не дазваляе. Жыве ўспамінамі: усё стаіць на тых жа месцах, што і некалькі гадоў таму.

Раіса Часнова, маленькая худая бабулька, узрадавалася нашаму прыходу. Калі даведалася, што мы са «Звязды», узгадала, як сама некалі працавала фотакарэспадэнтам у «Чырвонцы». Дастала з шафы кнігу Беларускага саюза мастакоў, дзе на адной са старонак напісана пра яе — журналіста-мастацтвазнаўцу.

У кватэры Раісы Пятроўны творчы беспарадак. Усё завалена кнігамі, фотаздымкамі, паперкамі. Побач з ложкам стаіць тэлевізар, чайнік, тэлефон, некалькі зэдлікаў. З-за хворага калена і арытміі старой цяжка шмат рухацца, таму неабходныя рэчы павінны быць пад рукой.

Мясцовы тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання прапаноўваў жанчыне сацыяльнага работніка, які б прыносіў прадукты, прыбіраўся ў кватэры. Але пенсіянерка адмовілася: была патрэбна іншая дапамога. З валанцёркай Вольгай Валянцінаўнай яна пазнаёмілася два гады таму.

— Нават не ведаю, што б я рабіла без яе, — прызнаецца Раіса Пятроўна. — Вольга Валянцінаўна дапамагла мне перажыць страту блізкіх, гэты шокавы, стрэсавы стан. У ёй я адчула блізкага чалавека. Для мяне цяпер галоўнае — духоўныя зносіны. З Вольгай Валянцінаўнай мы можам гаварыць пра што заўгодна. Аднолькавыя праграмы пра культуру па тэлевізары глядзім.

Дарэчы, блізкасць інтарэсаў валанцёраў і іх падапечных — заслуга Вольгі Пуцінцавай, якая свядома адбірае людзей, падобных па духу.

Два гады Раіса Пятроўна амаль не выходзіць на двор. Сёлета толькі тры разы выбралася з кватэры: на Новы год да ўнука, на лецішча і да ўрача. Знаёмых, з якімі можна было б проста пагутарыць, у бабулі мала. Суседзі ўсе новыя, не пойдзеш жа да іх: няёмка, дый у людзей свае планы. Жанчына папрасіла нас пакінуць нумары, каб мець магчымасць камусьці патэлефанаваць.

Унук, што застаўся сіратой, жыве ў Мінску асобна. Завочна вучыцца ва ўніверсітэце, працуе. Па магчымасці наведвае сваю бабулю, купляе ёй усё неабходнае. Прыносіць корм для ката, якога, дарэчы, сам і падарыў, каб жанчыне было не так сумна.

Удзень пенсіянерка чытае, робіць нейкія нататкі. Кажа, што піша эсэ для ўнука, разважанні пра тое, як старэць.

Вольга Валянцінаўна, у якой побач жыве дачка, часта наведвае самотную бабулю:

— Маёй маці было 98 гадоў, калі яна памерла, таму я ведаю, што яны адчуваюць. Маці жыла ў вёсцы і сядзела ля акна, чакала майго прыезду. Памятаю, як яна мяне сустракала, заўсёды са слязамі.

Валанцёркі прызнаюцца, што ў іх саміх часам не хапае сіл: немаладыя ўжо. Але жанчыны не могуць пакінуць сваіх падапечных, бо разумеюць, што без падтрымкі старыя зноў замкнуцца ў сабе і будуць жыць, адарваныя ад грамадства.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Песню бярыце з сабою

# АХ ТЫ, ЗІМАЧКА-ЗІМА!

**Зіма выпрабоўвае нас. Завеі ды маразы правяраюць нашы пачуцці на вернасць і шчырасць. Гарэзна-радасна распавядаецца пра гэта ў народнай песні «Ах ты, зімачка-зіма». Прага кахання робіць вольным шлях да ўзаемнасці.**

Душэўныя парыванні закаханых дзяўчат амаль аднолькава разгортваюцца на планеце. І жаданне беларускай дзяўчыны вельмі падобнае да нястрымнага памкнення расіянкі, што надзвычай узрушана выказваецца ў песні «Валёнкі»: «Как его любила! По морозу босиком к милому ходила». Сапраўднае каханне ўпрыгожвае навакольны свет... І робіць яго ўтульным нават зімою...

Песню «Ах ты, зімачка-зіма» запісаў этнамузыкант Рыгор Шырма ад Міхаіла Шуманскага, які ў 1940 годзе прыйшоў у Беларускі ансамбль песні і танца з вёскі Пераброддзе, што на Браслаўшчыне.




*Ах ты, зімачка-зіма,*
*Зіма лютая была,*
*Завеяла, замяла*
*Ўсе дарожкі, ўсе пуці.*

*Завеяла, замяла*
*Ўсе дарожкі, ўсе пуці,*
*Ўсе дарожкі, ўсе пуці, —*
*Недзе к міламу прайсці.*

*Я дарожкі размяту,*
*Сама к міламу пайду.*
*Сцялю, сцялю пасцялю*
*Пасцель пухавую.*

*Сцялю, сцялю пасцялю*
*Пасцель пухавую,*
*Каго верна я люблю,*
*Таго пацалую.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН** ■

### Неспрыяльныя дні і гадзіны ў студзені

***3, субота,*** *14.00 — 24.00*
***4, нядзеля,*** *0.00 — 3.00*
***5, панядзелак,*** *7.00 — 24.00*
***6, аўторак,*** *0.00 — 13.00*
***8, чацвер,*** *9.00 — 24.00*
***10, субота,*** *17.30 — 24.00,*
***11, нядзеля,*** *0.00 — 14.00*
***13, аўторак,*** *12.00 — 22.30*
***16, пятніца,*** *0.00 — 10.00*
***17, субота,*** *20.30 — 24.00*
***18, нядзеля,*** *0.00 — 14.30*
***19, панядзелак,*** *13.30 — 24.00*
***20, аўторак,*** *0.00 — 15.00*
***22, чацвер,*** *4.30 — 15.30*
***23, пятніца,*** *13. 30 — 24.00*
***24, субота,*** *0.00 — 16.00*
***26, панядзелак,*** *16.30 — 18.30*
***28, серада,*** *4.30 — 23.00*

# СТВОРЫМ ГІМН ЛЕСУ

**Мінлясгас запрашае ўсіх ахвотных прыняць удзел у адкрытым конкурсе на напісанне тэксту і музыкі гімна лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.**

Ён будзе прызваны служыць выхаванню ў работнікаў лясной гаспадаркі пачуцця гордасці за прыналежнасць да прафесіі лесавода, а таксама садзейнічаць захаванню і развіццю гістарычных традыцый, паведамляе прэс-служба міністэрства.

Конкурс стартуе з пачатку 2015 года, імя пераможцы (або пераможцаў) стане вядомым праз паўгода — 1 ліпеня. Больш падрабязную інфармацыю аб адкрытым конкурсе з умовамі, парадкам яго правядзення можна знайсці на сайце Мінлясгаса ў раздзеле «Конкурс «Гімн лясной гаспадаркі Беларусі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА СТРОИТЕЛЬСТВА

**5-я очередь строительства, Жилой дом № 7 (по генплану), комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале улиц Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая в г. Минске**

**Информация о Застройщике**

Застройщик (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА». Зарегистрировано решением № 653 Минского городского исполнительного комитета от 31.03.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190527399. Место нахождения (юридический адрес) застройщика: 220125, г. Минск, ул. Городецкая, д. 22, помещение 397, **телефон: 269-32-60.**

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, обед: 13.30-14.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Отдел продаж расположен в мобильном офисе на территории застройки «Маяк Минска» за Национальной библиотекой.

Режим работы отдела продаж: понедельник – пятница: с 8.30 до 20.30, суббота, воскресенье – 10.00 -20.00, без обеда.

СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА» в течение трех лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, были сданы в эксплуатацию многоквартирные жилые дома в г. Минске: по ул. Городецкой, дом № 22 (1-я очередь строительства 1-й пусковой комплекс, 2-й пусковой комплекс, 3-й пусковой комплекс), по ул. Ложинской, дом № 16 (2-я очередь строительства, 1-й пусковой комплекс, 2-й пусковой комплекс).

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 12 ноября 2009 г. № 541 «О реализации отдельных инвестиционных проектов в г. Минске» и инвестиционным договором от 14 июня 2011 г., зарегистрированным в Государственном реестре инвестиционных договоров с Республикой Беларусь 20 июня 2011 г., регистрационный № ИД-665, застройщик осуществляет реализацию инвестиционного проекта по строительству объекта, «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая в г. Минске».

**Информация о проекте**

Цель строительства – выполнение инвестиционного проекта «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул.Шафарнянской – Гинтовта – Ложинской – Городецкой в г. Минске».

**Многоквартирный жилой дома № 7 (по генплану)**

Дом № 7 (по генплану) входит в состав 5-й очереди строительства объекта ««Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянской – Гинтовта – Ложинской – Городецкой в г. Минске».

1-секционное 16-этажное (включая цокольный этаж) жилое здание, высота типового этажа – 3 м, высота встроенных помещений – 3,3 м. Здание имеет встроенно-пристроенные помещения общественного назначения.

Принятая конструктивная схема жилого здания с монолитным каркасом и заполнением ненесущих наружных стен блоками ячеистого бетона дает возможность максимальной вариативности при планировке помещений квартир под индивидуальные потребности покупателя, поэтому квартиры запроектированы без разделения внутреннего пространства перегородками (за исключением зоны санузлов) – так называемая «свободная планировка).

Здание оборудовано лифтами.

Внутренняя отделка в местах общего пользования: по стенам выполняется декоративная штукатурка с последующей покраской, полы – керамическая плитка, потолки – акриловая покраска.

Наружная отделка: декоративная штукатурка с последующей покраской атмосферостойкими красителями.

Окна – из профиля ПВХ, стеклопакет.

Остекление лоджий – рамы из профиля ПВХ с одинарным остеклением.

В соответствии с подпунктом 2.2 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 12 ноября 2009 г. N 541 «О реализации отдельных инвестиционных проектов в г. Минске» квартиры и встроенно-пристроенные помещения (кроме помещений общего пользования) запроектированы с применением строительных нормативов, аналогичных действующим в г. Москве, и до полной готовности Застройщиком не доводятся.

Перечень работ по доведению владельцами до полной готовности квартир:

1. Устройство межкомнатных перегородок.
2. Установка внутриквартирных дверей.
3. Установка подоконников.
4. Отделка квартир, включая устройство стяжек, полов с теплозвукоизоляцией, штукатурку, шпаклевку (за исключением несущих конструкций), окраску стен, потолков.
5. Внутриквартирная разводка водопровода и канализации с установкой сантехприборов и сантехфаянса.
6. Внутриквартирная электроразводка с установкой оконечных устройств, электрозвонков и электроплит.
7. Внутриквартирная разводка TV, телефонизация, радиофикация, домофонная сеть с установкой оконечных устройств.
8. Установка автономных дымовых пожарных извещателей.
9. Устройство встроенной мебели и антресолей.

Перечень работ по доведению владельцами до полной готовности встроенно-пристроенных помещений:

1. Устройство перегородок в соответствии с утвержденным проектом.
2. Установка дверей.
3. Установка подоконников.
4. Отделочные работы, включая устройство стяжек, полов с теплоизоляцией, штукатурку, шпаклевку и окраску стен и потолков.
5. Монтаж систем противопожарной автоматики и дымоудаления, охранно-пожарной сигнализации.
6. Внутренние разводки водопровода и канализации с установкой сантехприборов, сантехфаянса и запорной арматуры.
7. Установка приборов учета тепла, воды и электроэнергии.
8. Внутренние электроразводки с установкой оконечных устройств и светильников.
9. Внутренние разводки TV, телефонизация, радиофикация, домофонная сеть с установкой оконечных устройств.
10. Монтаж систем вентиляции, кондиционирования воздуха и других инженерных систем, предусмотренных проектом.
11. Монтаж технологического оборудования.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются квартиры стоимостью за 1 кв.м. в белорусских рублях в сумме, эквивалентной 3500 долл. США, помещения общественного назначения стоимостью за 1 кв.м. в белорусских рублях в сумме, эквивалентной 4000 долл. США. Предусмотрена система скидок.

**Технико-экономические показатели**

Этажность – 16 (включая цокольный этаж);
Количество секций – 1;
Количество квартир – 58,
Общая площадь квартир – 4699,07 м.кв.;
Общая площадь встроенно-пристроенных помещений – 570,2 м.кв;
Начало строительства – декабрь 2014 г.
Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию – январь 2016 г.

**Застройщиком получены:**

- решение Минского городского исполнительного комитета № 2657 от 23.10.2014 г.;
- свидетельство (удостоверение) № 500/1473-2884 о государственной регистрации создания земельного участка; возникновения права собственности Республики Беларусь на земельный участок, правообладатель – Республика Беларусь; возникновения прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок (право временного пользования), правообладатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь иностранное общество с ограниченной ответственностью «Зомекс Инвестмент»;
- экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» № 473-15/14И от 30.06.2014 г.;
- выданное 31.12.2014 г. органом государственного строительного надзора разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-206Ж-037/14;
- договор генерального строительного подряда № 01-08/ШГ-7-2014 от 23.10.2014, заключенный с ИООО «ДАНА АСТРА».

С планировками квартир, встроенно-пристроенных помещений и ходом работ по строительству можно ознакомиться в мобильном офисе компании, расположенном на территории застройки «Маяк Минска» за Национальной библиотекой.

**Дополнительную информацию можно получить по телефонам:** 8-029-5-000-840 (841, 844, 877), 8-044-768-81-13 (14), 8-044-746-18-96, 8-044-540-17-63 (64), 8-044-5-00-541, 8-044-505-20-04.



## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Плосковязальная машина РИМАК J21ТОР класс 7 зав. № 20728, начальная стоимость лота 366 183 000 рублей. **Лот № 2.** Плосковязальная машина РИМАК J21Плюс класс 10 зав. № 41080, начальная стоимость лота 263 280 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Чаровница» (г. Витебск, ул. П.Бровки, 20). |
| **Место-нахождение имущества** | г. Витебск, ул. П.Бровки, 20. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Чаровница» Рачковой Ларисе Александровне (раб. тел. 0212-58-80-21). |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белинвестбанк». |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32 **22 января 2015 года в 10.00** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома. 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел. (0212) 60 09 09. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 16.00 21 января 2015 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ №№ 1012703, 1012705-1012706, 1012708, 1012728, 1043104, 1043141, 1065288, 1085016, 1085020, 1104550, 1104569, 1108465-1108475, 1108477-1108479, 1108491, 1108493, 1116774, 1116788-1116790, 1116811, 1132994-1132997, 1132999, 1133026, 1133028, 1173053, 1248530-1248531, 1248538-1248542, 1248546-1248548, 1248550, 1248556, 1248560-1248561, 1248569-1248575.

УНП 100782388



**Считать недействительными страховые полисы и квитанции ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ №№ 1030541-1030544, 1051716, 1045459, 1076604, 1131871, 1217094, 1226566, 1238979, 1243920, 1247084, 1276373, 1228785, 1228786, 1228787, 1278599, 1320912, 1401671;
- квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 0924290, 3841588, 4285929, 3848239, 3848241, 3479990, 4287165.

УНП 100782388



## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Лесопогрузчик Амкодор 352Л, 2007 года выпуска, идентификационный №Y3А352Л0070029, двигатель № 052357, коробка передач № 15421, мощность двигателя 132 кВт, начальная стоимость лота 78 635 581 рубль. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Оршанский комбинат строительных материалов» (Оршанский район, г.п. Копысь, ул. Октябрьская, 80, УНП 300073637). |
| **Место-нахождение имущества** | Витебская область, Оршанский район, г.п. Копысь, ул. Октябрьская, 80. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Оршанский комбинат строительных материалов» Лукашевичу Игорю Викторовичу (раб. тел. 0216-27-66-89). |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белагропромбанк». |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. «Правды», 32 **21 января 2015 года в 10.00** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома. 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел. (0212) 60 09 09. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 10.00 20 января 2015 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## Антаніна КАРПІЛАВА:

# «Сфера мастацкасці, эстэтыкі, вобразнасці пайшла ў малыя формы: у дакументальнае кіно і анімацыю»

*«Разабрацца ў паняцці «мастацтва кіно» — тое ж самае, што знайсці сэнс жыцця. Але ж калі пошукі сэнсу жыцця ніколі не спыняліся, то і спробы зразумець, у чым заключаецца сутнасць мастацтва кіно і яго адрозненне ад кінапрадукту, маюць права на існаванне.*

*У гэтых пошуках да нас далучаюцца людзі са свету кінематографа. Яны раскажуць пра сваю працу, сваё бачанне кіно, пра метафізічнае і рэальнае, пра сусветнае і вузкасацыяльнае, пра важнае і банальна простае. Магчыма, гэтыя інтэрв'ю дапамогуць нам аддаліцца ад нязручных сацыяльных умоўнасцяў».*

**Напрыканцы мінулага года беларускае кіно адзначыла юбілей. Яго гісторыя стваралася 90 гадоў — доўга, слаўна, прыгожа — але яго сучаснае становішча выклікае шматлікія нараканні. Нацыянальны кінематограф, можа, і не ідэальны, але нечага варты. Чаго менавіта, мы змаглі высветліць у размове з загадчыцай аддзела экранных мастацтваў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдатам мастацтвазнаўства, адным з членаў конкурснай камісіі па адборы фільмаў рэспубліканскага конкурсу кінапраектаў Антанінай КАРПІЛАВАЙ.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

***— У вас, калі казаць пра беларускі кінематограф, не ўзнікае пачуцця настальгіі па савецкім часе?***

— Пачуццё настальгіі звязана з элементам смутку, а я наадварот — захапляюся, таму што за амаль векавую гісторыю беларускага кіно залаты век прыпаў на 1960-1980-я. Так, залатыя гады былі і падчас нямога кінематографа, у 1920-я, што ў першую чаргу было звязана з творчасцю Юрыя Тарыча. Але вылучылася менавіта пакаленне 1960-1980-х, якое скончыла ВГІК і ўсё паклала на алтар беларускага кінамастацтва. Гэта Віктар Тураў, Ігар Дабралюбаў, Барыс Сцяпанаў, Валерый Рубінчык, Віталь Чацверыкоў... Гэта было залатое дваццаціпяцігоддзе. Невыпадкова, што ў гэты час быў створаны лепшы фільм пра вайну, які ўвайшоў у спіс ЮНЕСКА, — «Я родам з дзяцінства» Віктара Турава.

***— Я хацела якраз спытаць пра «залаты перыяд». Яго межы магчыма акрэсліць?***

— Пачаць трэба з дэбюту Віктара Турава «Праз могілкі», заснаванага на аўтабіяграфічных матэрыялах. Наогул ластаўкай-прадвеснікам узлёту беларускага кіно стаў альманах, пра які многія забыліся, — «Апавяданні пра юнацтва». Яго курыраваў Юрый Тарыч, чым перадаў эстафету ад залатога часу нямога кіно да гуказрокавага і ўпершыню аб'явіў свету імёны Віктара Турава і Барыса Сцяпанава. Завяршыць мяжу варта 1986 годам, славутым фільмам Элема Клімава «Ідзі і глядзі», які называюць і кінапрывясецю, і кінатрагедыяй. Так, Элем Клімаў — маскоўскі рэжысёр, але ён настолькі прасякнуўся духам беларускай гісторыі, прозай Алеся Адамовіча, што мы лічым яго і беларускім аўтарам. Ён здымаў на месцах, дзе адбываліся трагедыі беларускіх хатыняў. 1986 год паказальны і знакавым фільмам Міхаіла Пташука «Знак бяды», экранізацыяй аповесці Васіля Быкава.

Гэты перыяд выразны ў мастацкім, эстэтычным плане (не адцягваючыся на ідэалагічныя моманты), хоць мастацтва — вельмі трапяткая тканіна, якая ад гэтых палітычных, ідэалагічных рэчаў залежыць.

***— У той час на першым месцы стаяў талент, аўтар ці ўсё ж ідэалогія?***

— Гэта час праявы індывідуальнасці, безумоўна. Кіно Віктара Турава — аўтарскае кіно, хоць сцэнары да яго фільмаў пісалі знакамітыя Генадзь Шпалікаў ці Алесь Адамовіч. Але яны былі аднадумцы, радок ад дэ Сэнт-Экзюперы «Усе мы родам з дзяцінства...» моцна ўвайшоў у іх лёс. Я ўжо не кажу пра Валерыя Рубінчыка, які заўсёды браў удзел у напісанні сцэнарыяў (гэта і «Вянок санетаў», і «Апошняе лета дзяцінства», і, вядома ж, «Дзікае паляванне караля Стаха»). Гэта і Валерый Рыбараў з фільмамі «Чужая Бацькаўшчына» і «Сведка».

Амаль усе фільмы гэтых аўтараў адносяцца да далікатнай, трапяткой і заўсёды актуальнай тэматыкі: дзеці і вайна. У Віктара Турава былі аўтабіяграфічныя матывы: яго бацька загінуў у партызанскім атрадзе, а сястра была адпраўлена ў Германію. У Валерыя Рубінчыка і Валерыя Рыбарава тэма вайны дадзена як бы адлюстравана, адрэфлексавана, яны самі яе не перажылі. Але яны паглыбіліся ў тэму, што можа сведчыць толькі пра высокі ўзровень таленту. Гэты перыяд асвятляе, безумоўна, Ігар Дабралюбаў, яго фільм «Іван Макаравіч», можа быць, недастаткова ацэнены сучаснай кінематаграфічнай практыкай. У карціне знаходзілі адгалоскі фільма Андрэя Таркоўскага «Іванава дзяцінства», але, нягледзячы ні на што, тут ёсць беларуская рэальнасць. Віталь Чацверыкоў пайшоў па іншым шляху, вельмі складаным: яму належыць фільм рэдкага жанру — кінаэпас — «Полымя», прысвечаны славутай аперацыі «Баграціён». Да гэтага часу фільм «Полымя» застаецца ўнікальным. Віталь Чацверыкоў настолькі цесна датыкнуўся да архіўных матэрыялаў і настолькі маштабна ўвасобіў тэму, што па гэтым шляху сцэнарысты і рэжысёры не адважыліся пайсці далей. «Беларусьфільм» невыпадкова называлі «Партызанфільмам». Ваенная тэма пранізвала залаты век беларускага кіно.

***— Можа, цікавасць да ваеннай тэматыкі і ёсць унікальная асаблівасць нашага кіно?***

— Калі казаць у гістарычным аспекце, то феномен беларускага кіно, сапраўды, у тым, што яно было паслядоўнікам ваеннай тэматыкі. Гэтая тэма не надуманая, яна крывавіць і да гэтых часоў. Акрамя таго, нашае кіно літаратурацэнтрысцкае, нашым базісам заўсёды была класічная літаратура. Тут творы Васіля Быкава, Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча... Трэцім момантам з'яўляецца гуманістычная накіраванасць, якая захоўваецца і ў сучасным кінематографе, нягледзячы на яго крызісны стан. Гэты гуманізм выяўляецца і ў тым, што кінематограф зноў звяртаецца да дзіцячай тэматыкі. Алена Турава, Сяргей Сычоў і Аляксандр Анісімаў у апошнія два гады стварылі цікавыя фільмы.

Усе мы, вядома, памятаем кіно Льва Голуба, адрасаванае менавіта дзецям, пачынаючы з фільмаў «Міколка-паравоз», «Дзяўчынка шукае бацьку». Мы памятаем мюзіклы Леаніда Нячаева, прызнанага генія беларускай кінематаграфіі, — «Прыгоды Бураціна», «Пра Чырвоны Каптурок. Працяг старой казкі» і іншыя — да нашага дзіцячага кіно на фоне такой магутнай традыцыі можна прад'яўляць пэўныя патрабаванні. Сучасны кінематограф здымаецца ў рамках сямейнага кіно, а фільмаў для дзяцей не хапае. Вядома, гэта выдатная жанравая форма, яна разлічана на прагляд карціны ўсёй сям'ёй, але ўласна на дзяцей беларускі ігравы кінематограф мала скіраваны. Мы рады адраджэнню гэтай нішы, але трэба іграць на больш трапяткіх струнах, звяртацца да больш патрабавальнай дзіцячай аўдыторыі.

***— А што можна сказаць пра анімацыю ў тэхніцы выцінанкі-вырazанкі? Гэта можна назваць нашай асаблівасцю?***

— Тое, што робіць Міхаіл Тумеля (рэжысёр-аніматар, які працуе ў тэхніцы выцінанкі. — **Аўт.**), — проста вытанчаны, неверагодны цуд. З гэтых папяровых выразанак ён стварыў цэлы свет беларускага фальклору. Ігравое кіно Беларусі прабуксоўвае, знаходзячыся ў складанай, крызіснай сітуацыі, мы ўсё часцей ужываем паняцце «прадукт». А сфера мастацкасці, эстэтыкі, вобразнасці пайшла ў малыя формы: у дакументальнае кіно і анімацыю. Ігар Волчак, Уладзімір і Алена Пяткевічы, Ірына Кадзюкова, Таццяна Кубліцкая, нашы аніматары, гэта незвычайна сціплыя, адказныя і таленавітыя людзі. Яны надзелены дарам абстрактнага, метафарычнага мыслення, якое патрабуе вобразнага асэнсавання і пастаяннага погляду на свет як незвычайнага, нерэальнага. Наша анімацыя славіцца тым, што застаецца шмат у чым рукатворнай. Дзе яшчэ будуць займацца гэтай карпатлівай працай у тэхніцы перакладкі або папяровай марыянеткі? Лепшыя нашы майстры прайшлі школу ў Маскве, вучыліся ў Фёдара Хітрука, Юрыя Нарштэйна і іншых — адсюль гэтая скрупулёзнасць, шматпавярховасць. Сучасны аніматар Ігар Волчак заўсёды адсылае форму сваіх фільмаў да музычнай формы, яго разам з Алегам Белаусавым можна назваць стваральнікам беларускай анімацыйнай школы. Пра гэта трэба казаць уголас, таму што наша анімацыйная школа існуе, і гэта пацвярджаюць шматлікія прызы на кінафестывалях.

***— У 2012 годзе ў краіне ўведзена новая сістэма дзяржфінансавання, згодна з якой праекты, каб атрымаць сродкі з бюджэту, павінны прайсці конкурс...***

— Рынак Беларусі надзвычай абмежаваны: кінастудыя «Беларусьфільм», некалькі кінакампаній і аўтараў-адзіночак ствараюць наша кінематаграфічнае поле. Сярод сцэнарыяў конкурсу (Антаніна Карпілава — член конкурснай камісіі ў галіне анімацыйнага кіно і кіно для дзяцей. — **Аўт.**) у асноўным дамінуюць тэксты «Беларусьфільма». Мы добрасумленна чытаем праекты, абмяркоўваем па многіх параметрах, вядома ж, у першую чаргу з пункту гледжання адлюстравання нацыянальнай тэматыкі, нацыянальнага характару, таму што ва ўсім свеце падтрымліваюць, вядома ж, сваю кінематаграфію. Дзе, калі не ў анімацыі і дзіцячых фільмах, адлюстроўваць духоўныя, гуманістычныя каштоўнасці, архетыпы культуры, узнімаючыся вышэй — культурны код нацыі? З гэтага пункту гледжання мы зацвярджаем сцэнарыі. Трэба сказаць, што наш вердыкт носіць толькі рэкамендацыйны характар, хаця часам на нас «коцяць бочкі». Усе тры камісіі (яшчэ ў галіне ігравога і дакументальнага кіно) справядліва працуюць, а хто ўрэшце вырашае — невядома. Бо сцэнар — пункт адліку. Вядомы выраз: для добрага фільма патрэбен сцэнар, сцэнар і сцэнар. Хоць праблема рэжысуры стаіць вельмі востра. З дакументальным кіно, з анімацыяй — у нас нармальна. А ігравое правісае.

**Мастацтва ствараецца аўтарамі з арыгінальным мысленнем і накіравана на глыбокага і адукаванага гледача.**

***— На чым заснавана наша дакументальнае кіно?***

— Дакументальнае кіно — наш гонар, яно таксама мае сваю залатую старонку. З часоў Віктара Дашука, Міхаіла Жданоўскага, Юрыя Гарулёва, Сяргея Пятроўскага і многіх іншых гэта кіно, якое стварае дакумент часу. Знамянальны цыкл «У вайны не жаночы твар» Віктара Дашука прыадкрыў жанчыну ў экстрэмальных абставінах. Рэжысёр падняўся вышэй заяўленай задачы, ён перайшоў на псіхааналітычнае даследаванне паводзін славянскай жанчыны ў памежных сітуацыях — гэта працяг вялікіх традыцый славянскай літаратуры. Сучаснае дакументальнае кіно таксама даследуе беларускую ментальнасць, беларускі этнас. Тут лідзіруе два імені — Віктар Аслюк («Мы жывём на краі», «Кола», «Драўляны народ») і Галіна Адамовіч («Геній месца», «Завядзёнка», «Інакіня»). Яны працягваюць даследаванне беларускага характару ў нярпостых сучасных сацыяльных умовах. Калі ў Аслюка гэта ў асноўным прастора беларускага сялянства, то Галіна Адамовіч выходзіць і на іншыя сацыяльныя ўзроўні. Трэба адзначыць, што захоўваюць сваю творчую сілу Міхаіл Жданоўскі і Юрый Гарулёў, якія працягваюць працаваць у рэчышчы дакументальнага даследавання.

***— Мы ў асноўным гаворым пра «Беларусьфільм». Ці ёсць у нас іншае кіно, пра якое варта згадаць?***

— Сярод адзіночак-энтузіястаў ёсць людзі, якія здымаюць за свае грошы. Той жа Кірыл Нонг, фільм якога можна знайсці ў інтэрнэце. Ёсць надзеі на Наталлю Галузу, якая не так даўно прадставіла сваю карціну «Цімур і каманда». Можна назваць серыял «Вышэй за неба» Андрэя Курэйчыка і Дзмітрыя Марыніна, фільм Андрэя Мычко «Адаленьтрава». Хочацца верыць у гэтую індывідуальнасць. На жаль, многім не хапае прафесіяналізму, усе аматарскія напрамкі знаходзяцца яшчэ ў полі паўпрафесійнага кіно, хоць і пачынаюць набываць вагу. Але пакуль што «Беларусьфільм» на невялікім рыначным полі з'яўляецца галоўным гульцом.

***— Так складваецца, што практычна ўвесь беларускі кінематограф грунтуецца на дзяржаўных грошах. Гэта нейкім чынам на ім адбіваецца?***

— Мы для пачатку павінны сказаць дзяржаве дзякуй. Вядома, дзяржаўныя грошы — значыць сацыяльны заказ, выкананне ідэалагічных, стратэгічных планаў. Але я бачу, што незалежнае кіно ідзе ў рэчышчы агульнадзяржаўных тэндэнцый: гэта тыя ж сямейныя, гуманістычныя каштоўнасці. Трэба сказаць, і сацзаказ выконваецца не ў поўнай меры. Напрыклад, перад пачаткам Алімпіяды мы засталіся без спартыўнага фільма, хоць — я ведаю — быў варты сцэнарый пра біятлон. Дзе ён згубіўся?.. Наша кінастудыя называецца нацыянальнай, хаця нацыянальныя праекты толькі ўмоўна можна такімі назваць. Ёсць «Белыя Росы. Вяртанне», але гэта рэмейк. Я ведаю, што ёсць выдатны сцэнарый Алены Калюновай «Забраны край» пра лёс Янкі Купалы з добрым культуралагічным кантэкстам, інтрыгай — мы былі ў захапленні. У нас ляжаць сапраўдныя жамчужыны, якія толькі падабраць — праславішся. Дарэчы, ужо існуе стратэгія развіцця кінематографа на 2015—2020 гады, дзе прапісаны пункт пра дэбюты (што было і раней), але ўпершыню падрабязна ідзе гаворка аб фестывальных фільмах, як мы кажам — арт-хаусных.

***— Вы казалі, што апошнім часам у дачыненні да кіно ўсё часцей выкарыстоўваецца паняцце «прадукт». А што такое мастацтва кіно?***

— Паняцце «прадукт» цесна звязана з паняццем «тавар». Гэта характарыстыкі камерцыйнага кіно, дзе асноўная стаўка робіцца на эфектыўны прадукт. Так, якасны прадукт накіраваны на атрыманне сродкаў, на матэрыяльную аддачу ад гледача. Між тым мастацтва кіно накіравана на пошук новых формаў мастацкай выразнасці, вылучаецца ўнікальнай канцэпцыяй свету і чалавека, нестандартнымі творчымі ідэямі. Яно ствараецца аўтарамі з арыгінальным мысленнем і накіравана на глыбокага і адукаванага гледача. Але сёння прадукт амаль цалкам выцесніў такія з'явы, як кінатвор, аўтарскі фільм.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ПАКАШТУЙЦЕ

## Незвычайны фаршмак

***Спатрэбіцца:** селядзец — 1 шт., яйка (варанае) — 1 шт., морква (невялікая вараная) — 1 шт., цыбуля рэпчатая (невялікая) — 1 шт., сыр плаўлены — 100 г, хлеб (барадзінскі) — 1 лустачка, яблык (зялёны) — 1 шт., алей.*



Селядзец разабраць, каб атрымалася 2 філе. Хвост і невялікі кавалачак селядца трэба пакінуць для афармлення. З кожнага філе струґаем тонкія пласты. Да таго часу, пакуль ніжні пласт не стане таўшчынёй усяго 3-4 мм. Зрэзаны селядзец, бялок яйка, цыбулю і моркву наразаем на дробныя кубікі. Усё злучаем і запраўляем алеем. Дабаўляем плаўлены сыр, надзёрты на сырнай тарцы. Змешваем. Апрацоўчую дошку пакрываем харчовай плёнкай, крыху змазваем яе алеем. Выкладваем на плёнку тонкае філе селядца, якое мы падрыхтавалі раней. На селядзец выкладваем слой толькі што прыгатаванага фаршмаку, робячы невялікія водступы па краях. Цяпер накрываем другой тонкай паловай селядца — літаральна абгортваем, каб яна аблягала нашу начынку. Затым змазваем паверхню селядца алеем. І туга ўкручваем у поліэтыленавую плёнку. Ставім нарыхтоўку ў халадзільнік мінімум на гадзіну (але ў такім выглядзе яна можа захоўвацца каля 4-5 дзён). Перад падачай дастаём з халадзільніка, выдаляем з нарыхтоўкі плёнку і наразаем. Падсушаны кавалачак барадзінскага хлеба здрабняем блендарам і крошкі запраўляем алеем. Раскладваем кружочкі фаршмаку па талерцы, а ў цэнтры — хлебныя крошкі, пасыпаныя нарэзаным на дробныя кубікі яблыкам.

## Калядны кекс з сухафруктамі

***Спатрэбіцца:** 5 яечных жаўткоў, трохі рому, 1 пакецік разрыхляльніка, 120 г масла, 300 г любых сухафруктаў, 130 г мукі, цэдра паловы лімона, 120 г цукровай пудры.*



Наразаем сухафрукты, затым заліваем іх ромам і даём ім крыху пастаяць, пакуль замешваем цеста. А тым часам узбіваем мяккае масла з цукрам і дабаўляем па адным жаўтку. Як толькі атрымліваем аднастайную і пышную масу, падсыпаем прасеяную муку, дзёртую цэдру лімона, разрыхляльнік, а потым і сухафрукты. Цяпер гатовую масу перакладаем у форму для кекса, змазаную алеем, і адпраўляем у духоўку, разагрэтую да 180 градусаў. Выпякаем хвілін 30-40. Пасыпаем гатовы кекс цукровай пудрай.



### УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Ажурныя яблычкі да Раства

**Такія яблыкі могуць стаць асноўным упрыгажэннем святочнага стала.**

*__Спатрэбіцца:__ 140 г цукровай пудры, 1 яечны бялок, некалькі кропель лімоннага соку.*



Узбіваем інгрэдыенты міксерам, атрыманую сумесь змяшчаем у поліэтыленавы пакецік. Куток пакецікa трошачкі абразаем, а цяпер можна маляваць



на яблычках мудрагелістыя ўзоры.

Яблычкі павінны падсохнуць на працягу некалькіх гадзін.

### ВАРТА ВЕДАЦЬ

## Як правільна размарозіць мяса

Дасведчаныя кулінары сцвярджаюць, што мяса і птушку лепш размарожваць у вадзе, якая перадае цяпло ў 20 разоў хутчэй, чым паветра. Самы лепшы і бяспечны спосаб — размарожванне мяса ў ледзяной вадзе, паколькі пры гэтым яно застаецца халодным, не губляе свежасці і адначасова размарожваецца. Калі кавалак мяса досыць вялікі і вы маеце дастаткова часу, лепш за ўсё размарожваць яго ў халадзільніку.

Існуе яшчэ адзін спосаб размарожвання мясапрадуктаў — спачатку перамясціць мяса ў халадзільнік на суткі, не здымаючы вакуумнай упакоўкі, а потым за дзве гадзіны да прыгатавання дастаць яго з халадзільніка або на 15 хвілін пакласці ў цёплую ваду. Тэмпература размарожанага мяса павінна быць пакаёвай — гэта гарантуе, што мяса прасмажыцца раўнамерна, а вітамінныя страты будуць мінімальнымі. Калі вы размарожваеце мяса на кухні, не трымайце яго на паветры даўжэй за дзве гадзіны, каб не ствараць спрыяльную глебу для размнажэння мікраарганізмаў.

### Некалькі хітрасцяў размарозкі

✓ Калі вы размарожваеце мяса ў цёплай вадзе, змясціце яго ў воданепранікальны пакет, паколькі цёплае асяроддзе паявлічвае хуткасць размнажэння бактэрый.

✓ Печань лепш размарожваць у цёплай вадзе з малаком — так у ёй захоўваюцца ўсе пажыўныя рэчывы, яна набывае мяккасць і прыемны салодкі смак.

✓ Мяса, якое не патрабуе рэзкі, сячэння і трыбушэння, лепш не размарожваць, а гатаваць адразу ж пасля таго, як яно пакінула маразільную камеру.

✓ Колькі можна захоўваць размарожанае мяса ў халадзільніку? Двое сутак — гэта максімальны тэрмін захоўвання, аднак усё залежыць ад якасці і «ўзросту» мяса, таму калі не ўдалося прыгатаваць прадукт адразу пасля размарожвання, лепш яго замарынаваць і прыгатаваць на наступны дзень.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 17.00 | 7.32 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.42 | 7.17 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.50 | 7.32 |
| Гомель — | 9.06 | 16.55 | 7.49 |
| Гродна — | 9.42 | 17.17 | 7.35 |
| Брэст — | 9.34 | 17.26 | 7.52 |

## Месяц

*Поўня 5 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

***Пр.** Ульяны, Міхаіла, Мікіты, Пракопа, Пятра.*
***К.** Генавефы, Данугы, Здзіслава, Люцыяна, Пятра.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Сустрэча Новага года, гадзіна да апоўначы, званок у дзверы. Доўга ніхто не хоча ісці адчыняць, але праз некаторы час нарэшце адчыняюць. На парозе стаіць цешча:

— Чаму так доўга не адчынялі? Ужо Казу сустракаеце?

— Ужо сустрэлі, праходзьце.

**Парада ўрачоў да навагодніх свят: не ўжывайце спіртное разам з іншымі лекамі!**

Новы год — гэта такая дурная ноч, калі нельга сядзець у інтэрнэце, каб тыя дурні, якія сядзяць у Новы год у інтэрнэце, не падумалі, што ты такі ж.

**НАРОДЖАНЫЯ 3 студзеня**

**Іх жыццё вызначаецца адной рысай: калі яны распачалі якую-небудзь справу, то цалкам аддаюцца ёй. Іх зацікаўленасць настолькі вялікая, што немагчыма сабе ўявіць, каб яны перасталі займацца гэтай справай. У калектыве гэта самыя надзейныя супрацоўнікі, уважлівыя, акуратныя, ініцыятыўныя, якія могуць пераканаць іншых у асабістай праваце і валодаюць моцнай сілай волі. Даволі часта яны бываюць упартымі, за што ім і перападае. Іх моцны бок — адданасць справе, слабы — скрытнасць.**

**НАРОДЖАНЫЯ 4 студзеня**

**Людзі гэтага дня валодаюць цудоўным талентам: яны могуць вырашыць любую праблему, што вынікае з умення аналізаваць сітуацыю, пранікаць у глыбіню пытання. Яны адрозніваюцца прагматычнасцю, а іх фантазія абапіраецца на зусім зямную рэальнасць. Такія людзі маюць прыхільнасць да калекцыянавання, лічацца асобамі са сваім уласным стылем, прамыя і нецярпімыя, але з-за сваёй замкнёнасці і ўдумлівасці часта маюць цяжкасці ў адносінах з дзецьмі.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 3 СТУДЗЕНЯ



**1850** год — нарадзілася Соф'я Кавалеўская, вучоная, пісьменніца, грамадская дзяячка. Першая ў свеце жанчына-прафесар матэматыкі паходзіць са старажытнага шляхецкага беларускага роду. Дзяцінства правяла ў маёнтку Палібіна Віцебскай губерні. Не атрымаўшы права (а ўсё толькі таму, што была жанчынай) выкладаць ва універсітэтах Расіі, яна стала прафесарам Стакгольмскага ўніверсітэта. «Я атрымала ў спадчыну запал да матэматыкі, музыкі і паэзіі ад дзеда, астранома Шуберта; асабістую свабоду — ад Польшчы; ад цыганкі-прабабкі — любоў да бадзяжніцтва і няўменне падпарадкоўвацца прынятым звычаям; астатняе — ад Расіі»... Яна пражыла кароткае жыццё — усяго сорак адзін год — але не толькі ўнесла важкі ўклад у тэорыю аналітычных функцый, не толькі ўдакладніла вылічэннямі форму кольцаў Сатурна, але і напісала займальны аўтабіяграфічны раман «Вера Варанцова».

**1905** год — 110 гадоў таму нарадзіўся (вёска Цітва, цяпер Пухавіцкі раён) Уладзімір Хадыка, беларускі паэт і перакладчык. У 1923 годзе скончыў агульнаадукацыйныя курсы ў Мінску. Настаўнічаў, быў сакратаром выканкама сельсавета. З 1929 года жыў у Мінску. Быў членам «Маладняка». Аўтар зборнікаў паэзіі «Суніца», «Радасныя будні», лірычных цыклаў «На ўзлёты дзён», «Песні з поўдня» і іншых. Рамантычную акрыленасць яго паэзіі высока ацаніў Я. Купала. На беларускую мову пераклаў раман М. Шолахова «Ціхі Дон» і іншыя творы пісьменніка. Лёс паэта склаўся трагічна. Ужо ў канцы 20-х гадоў XX ст. яго абвінавачвалі ў «буржуазным нацыяналізме». У 1936-м быў арыштаваны, у 1937-м асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі. Памёр у 1940 годзе. Рэабілітаваны ў 1954 г.

**1950** год — 65 гадоў таму нарадзіўся Альбін Сцяпанавіч Казярук, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі аптычнага прыборабудавання, доктар тэхнічных навук (1998), прафесар (1999). У 1972 годзе скончыў Чарнавіцкі ўніверсітэт. У 1972-1979-м працаваў на Мінскім механічным заводзе імя С.І. Вавілава, з 1984-га — у БНТУ. Аўтар навуковых прац па тэхналогіі і абсталяванні дакладнага прыборабудавання. Распрацаваў тэхналагічнае абсталяванне для адначасовай двухбаковай апрацоўкі высокадакладных дэталяў машын і прыбораў.

### Было сказана

**Жорж САНД, французская пісьменніца:**

*«Прастата — гэта тое, што найцяжэй за ўсё на свеце. Гэта — крайняя мяжа вопыту і апошняе намаганне генія».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.943. Індэкс 63850. Зак. № 20.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 студзеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12